❑ *Вярхоўны Савет прыступае да абмеркавання змяненняў у падатковым заканадаўстве.* 1-я—3-я стар.

❑ *«Дзяржаўныя сакрэты» пра валюту, якія ў Міністэрстве абароны хто-ніхто вельмі не хацеў бы раскрываць...* 1-я—3-я стар.

❑ *На з'ездзе Беларускай сялянскай партыі са 109 дэлегатаў 48 прадставялялі... горад Мінск. Што б гэта значыла?* 2-я стар.

❑ *Труна з Чачні. Яна даставлена днямі ў Гомель.* 1-я стар.

ЗВЯЗДА

14 лютага 1996 г. серада, № 43 (22846)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

Першыя кампенсацыйныя выплаты — ахвярам беларускіх «МММ»

Апошнім часам імя генеральнага дырэктара вытворча-камерцыйнай фірмы «Белнацыянал-сервіс» Ігара Клюева набыло шырокую вядомасць. Прычына на тое адна: прадпрымальнік з'яўляецца старшынёй Беларускага аб'яднання пацярпеўшых укладчыкаў.

На пачатку гэтага тыдня адбылася першая выплата грашовых сродкаў людзям, якія ў свой час паспрабавалі хоць нейкую капейчыну зарабіць на невялікіх сумах, якія даверылі пад працэнты, як высветлілася, сапраўдным жулікам. Па 500 тысяч беларускіх рублёў было выдадзена пяцідзесяці ўкладчыкам.

Журналістаў на імправізаванай прэс-канферэнцыі Ігара Клюева найбольш цікавіла, адкуль гэтыя грошы. Першую выплату ажыццявілі за кошт фірмы «СОЭЛ» (генеральны дырэктар Уладзімір Шахновіч). Грошы з'явіліся дабрачынным укладам і таму, магчыма, не будуць абкладацца падаткам. Як жа вызначылі пяцьдзесят найбольш пацярпеўшых? Імі сталі ў першую чаргу інваліды вайны (са спіса кожнай з зарэгістраваных у аб'яднанні фірмаў накшталт «МММ»).

Па сённяшнім часе ўсялякая дабрачыннасць выклікае ў людзей сумненні і недавер. Вось і ў Клюева найперш пыталіся пра незразумелы яго альтруізм. Пра тое, што, магчыма, выплаты будуць зроблены толькі першым заяўнікам з велізарнага атрада ўкладчыкаў (мяркуецца, што ахвяр ўсяго недзе каля 100 тысяч).

Падставы для сумненняў у многіх узнікаюць яшчэ і па той простай прычыне, што праблему любых ахвяр (а яшчэ ў большай ступені — ахвяр Ашчаднага банка) нельга вырашыць шляхам нават самай паспяховай камерцыйнай дзейнасці і таму ў некаторых складваецца ўражанне, што клопаты пра ўкладчыкаў узнікаюць на палітычнай глебе, пры наяўнасці жадання выкарыстаць грамадскую сілу (праўда, кольскасна даволі невялікую) для вырашэння пэўных задач.

Але ж галоўным суддзёй і ў гэтай сітуацыі выступіць час. Міне, мусіць, усяго некалькі месяцаў, магчыма, паўгода, трошкі болей — і людзі (як укладчыкі-ахвяры, так і звычайныя сузіральнікі) самі паставяць адзнаку Беларускаму аб'яднанню пацярпеўшых укладчыкаў.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!
ПАВАЖАНЫЯ ВОІНЫ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ!

15 лютага 1996 года спаўняецца 7 гадоў з дня выводу войскаў з Афганістана. Гэты дзень у Рэспубліцы Беларусь аб'яўлены Днём памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Мы нізка схіляем галовы перад вамі, воіны-інтэрнацыяналісты, перад памяццю загінуўшых і памёршых ад ран вашых сабратоў. Адыходзяць у мінулае лакальныя войны і ваенныя канфлікты, у якіх удзельнічалі грамадзяне рэспублікі, але гора бацькоў, удоў і дзяцей-сірот болем адгукаецца ў нашых сэрцах.

Мы яшчэ раз пацвярджаем сваю прыхільнасць да міру і заяўляем, што ні адзін салдат нашай дзяржавы больш не будзе ваяваць, значыць, і гінуць у іншых краінах.

Рэспубліка Беларусь адной з першых падпісала ўсе пагадненні СНД па праблемах удзельнікаў войнаў, членаў сем'яў загінуўшых (памёршых), грамадзян, якія прымалі ўдзел у лакальных войнах і ваенных канфліктах і прапаўшых без вестак. Кіраўніцтва рэспублікі будзе настойліва выконваць гэтыя пагадненні і, нягледзячы на яе эканамічныя цяжкасці, аказваць воінам-інтэрнацыяналістам сацыяльную падтрымку і адрасную дапамогу.

Спадзяюся, што вы накіруеце свае намаганні на выхаванне ў падрастаючага пакалення павагі да працы, аказанне дзяржаўным органам садзейнічання ў вывядзенні нашай краіны з эканамічнага крызісу і павышэнні жыццёвага ўзроўню беларускага народа.

Моцнага здароўя вам, вялікага шчасця, салдацкай мужнасці ў гэты нялёгкі час.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

НА ПРЫЁМ ПА АСАБІСТЫХ ПЫТАННЯХ — ДА КІРАЎНІКА ПАРЛАМЕНТА

З прыёму па асабістых пытаннях пачаўся чарговы рабочы тыдзень Старшыні Вярхоўнага Савета Сямёна Шарэцкага. Звыш 100 пісем, скаргаў, заяў прыходзіць кожны дзень на імя кіраўніка вышэйшай заканадаўчай улады, кожнае з якіх не застаецца без адказу. І хоць распарадак дня яго вельмі насычаны, усё ж Сямён Георгіевіч знайшоў некалькі гадзін у першай палове панядзелка, каб асабіста сустрэцца з людзьмі, якія чакаюць ад аднаго з кіраўнікоў дзяржавы ўзаемаразумення і дапамогі.

У час гутаркі ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, які ў 1947 годзе быў арыштаваны за крадзеж, які ён не ўчыняў, і рэабілітаваны пасля чатырох гадоў лагераў, абураўся тым, што з яго жыцця несправядліва выкраслена некалькі гадоў, падарвана здароўе, нанесена непапраўная маральная траўма. Між тым, згодна з існуючым заканадаўствам, дзяржава прадугледжвае кампенсацыю толькі тым асобам, якія сталі ахвярамі рэпрэсій па палітычных матывах. «Любы чалавек, які пацярпеў дарэмна, незалежна ад таго, хто яго рэпрэсіраваў, мае права на дапамогу дзяржавы», — падкрэсліў у гутарцы з ветэранам Сямён Шарэцкі.

Трэба адзначыць, што да гэтай размовы Старшыня Вярхоўнага Савета падрыхтаваўся загадзя і адразу ж змог прапанаваць чалавеку канкрэтную дапамогу ў вырашэнні яго праблемы. Але, на жаль, такія выпадкі не адзінкавыя. Таму, на думку Сямёна Шарэцкага, мэтазгодна ўнесці змяненне ў закон, які датычыць гэтай катэгорыі грамадзян.

Асобны круг просьбаў склалі жыллёвыя праблемы. На жаль, пры ўсім жаданні кіраўнік парламента не змог бы ашчаслівіць усіх людзей, якія страцілі надзею. Адзінае, чым можа кіравацца службовая асоба, — гэта закон і толькі закон. І хоць далёка не ўсе просьбы, што прагучалі ў час прыёму, адносіліся да кампетэнцыі Вярхоўнага Савета, усё ж на многія свае звароты людзі змаглі непасрэдна пры размове са Старшынёй Вярхоўнага Савета атрымаць адказ ці неабходную кансультацыю. У шэрагу выпадкаў пытанні, якія патрабуюць больш дэталёвага вывучэння, узяты на заметку.

Далёка не ўсе, хто запісаўся на прыём, звярнуліся да Сямёна Шарэцкага з асабістымі просьбамі. Частку наведвальнікаў хвалявалі праблемы, што датычаць развіцця народнай асветы, аховы здароўя, павышэння эфектыўнасці працы, узаемаадносінаў кіраўнікоў і падначаленых. Выказаныя імі прапановы, несумненна, стануць прадметам стараннага вывучэння як Старшынёй Вярхоўнага Савета, так і ў пастаянных парламенцкіх камісіях.

Ларыса ЛАЗАР, БЕЛТА.

ВОЗГАДАЕ POSTAIAE

ЯК БУДЗЕМ ВЯРТАЦЬ ДАЎГІ ЗА ГАЗ?

Адна з мноства праблем, якая зараз выклікае заклапочанасць у рэспубліцы, — завінавачанасць за пастаўку расійскага газу. Час вяртаць даўгі, відаць, прыйшоў.

Інакш як растлумачыць той факт, што расійскі «Газпром» у чарговы раз даслаў нашаму ўраду тэлеграму, змест якой зводзіцца да таго, што трэба ў сціслым тэрміны аплаціць даўгі прадпрыемстваў Беларусі за газ, які пастаўляецца з Расіі. Каб атрымаць каментарый наконт гэтай сітуацыі, мы звязаліся з генеральным дырэктарам дзяржаўнага прадпрыемства «Белтрансгаз».

Па словах генеральнага дырэктара «Белтрансгаза» Мікалая Мачарнюка, сітуацыя на сённяшні дзень зноў-такі застаецца незайздроснай. «Газпром» патрабуе стопрацэнтнай аплаты бягучых плацяжоў. Між іншым, толькі на 1 студзеня гэтага года Беларусь павінна выплаціць разам з пеняй вялікую суму, якая складае 720 мільёнаў долараў. Наўрад ці без урадавага ўмяшання гэта пытанне можна будзе вырашыць.

Калі весці гутарку аб спажыўцах газу — беларускіх прадпрыемствах, то за студзень узровень іх плацяжоў склаў усяго толькі 53 працэнты, 47 працэнтаў не аплачаны. Усяго ж у гэтым годзе за паўтара месяца запазычанасць дасягнула ўжо 47 мільёнаў долараў. Лічба, прама скажам, даволі значная.

Панацэяй у гэтай сітуацыі, на думку Мікалая Пятровіча, можа стаць тое, што спажыўцы газу нарэшце павінны зразумець, што трэба плаціць. Аднак сёння фінансавае становішча многіх вытворчых прадпрыемстваў не дазваляе ім нават своечасова выплачваць зарплату. Як быць?..

Як нам стала вядома, зараз складаецца графік выплаты даўгоў расійскаму прадпрыемству. Чым закончыцца справа, думаем, «Звязда» паведаміць сваім чытачам.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

БАРЫСАЎСКІ ЗАВОД СПАДЗЯЕЦЦА ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У АСВАЕННІ ВЫПУСКУ «ФОРДА»

Сёння на Барысаўскі завод пластмасавых вырабаў прыбудзе дэлегацыя фірмы «Ford». Мэта візіту — ацаніць тэхнічныя магчымасці прадпрыемства.

Па меркаванню дырэктара завода Леаніда Родзіча, прадпрыемства здольна прыняць удзел у рэалізацыі праекта, ажыццяўляць пастаўкі камплектуючых для беларускага «Форда». Аб гэтым сведчыць трывалае супрацоўніцтва з Мінскім мотавелазаводам, асваенне выпуску на заводзе тармазных сістэм для грузавых аўтамашын, якія зараз праходзяць выпрабаванні на МАЗе.

На сённяшні дзень на Барысаўскім заводзе пластмасавых вырабаў займаюцца рэалізацыяй праграмы па арганізацыі вытворчасці поліэтыленавых труб. Выкананне гэтай праграмы дазволіць паскорыць газіфікацыю раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.

Жанна КАТЛЯРОВА.

НЕ ЎСЁ З ПРЫЛАЎКА МОЖНА ЕСЦІ

Дзве трэці з праверанных Віцебскім цэнтрам стандартызацыі і метралогіі прадпрыемстваў вобласці парушаюць патрабаванні нарматыўнай дакументацыі пры выпуску прадукцыі.

За выраб і продаж недабраякасных вырабаў за 1995 год было наложана штрафаў на суму 730 млн. рублёў. 480 разоў уводзіліся забароны на рэалізацыю партый нестандартнай прадукцыі. Насырожвае той факт, што больш за палову праверак якасці прадуктаў харчавання далі адмоўны вынік, г. зн. аказаліся непрыдатнымі да харчавання. Не толькі свае бракаробы запаўняюць прылаўкі. 20 партый харчовай прадукцыі, што ўвозіліся на тэрыторыю вобласці ў мінулым годзе, таксама не атрымалі ад цэнтра стандартызацыі і метралогіі сертыфікатаў адпаведнасці.

Крайнімі, як звычайна, аказаліся дзеці: у 85 працэнтах правераных сталовых школ, ПТВ, ВНУ рэцэптура страў не захоўвалася, вага порцый была заніжана, ежа рэалізоўвалася прыгарэлай ці нясвежай.

Аляксандр ТУЛБУСАЎ.

ЗАГІНУЎ У ЧАЧНІ

Страшны груз прыйшоў у Гомель з Чачні — труна з целам афіцэра расійскай арміі Аляксандра Рыбакова, якому было ўсяго дваццаць пяць гадоў.

Сярэднюю школу Саша закончыў у горадзе над Сожам з сярэбраным медалём, а Ташкенцкае вышэйшае агульнавайсковае камандзнае Чырванасцяжнае ордэна Чырвонай Зоркі вучылішча імя Леніна — з чырвоным дыпломам. Служыў у Пермскай вобласці і прасіўся перавесціся ў Беларусь, бліжэй да маці Лідзіі Ягораўны, якая працуе на Гомельскім электратэхнічным заводзе. Не пусцілі.

З лета мінулага года рота камандзіра старшага лейтэнанта Аляксандра Рыбакова была камандзіравана ў Чачню, і неўзабаве павінна была вярнуцца на месца дыслакацыі. Але яна не далічылася многіх сваіх воінаў. Толькі ў адным баі, у якім удзельнічаў і Аляксандр, загінула васемнаццаць расійскіх салдат. Сярод іх і ротны, наш зямляк, якога пахавалі ў Гомелі, на радзіме. Не дай, Божа, прымаць нам такія грузы, абарані нашых дзяцей ад недарэчных войнаў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

МІНІСТЭРСКІ ПАРТФЕЛЬ — НА ДЫПЛАМАТЫЧНЫ КЕЙС?

Як стала вядома карэспандэнту БЕЛТА, міністр культуры і друку Анатоль Бутэвіч, які застаўся без партфеля, магчыма, атрымае новае назначэнне — на работу за мяжой. Яго кандыдатура разглядаецца на пасаду Генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у Гданьску.

Ларыса ЛАЗАР, БЕЛТА.

НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫК, СЦЕРАЖЫСЯ!

Усё больш сем'яў на Віцебшчыне перастае плаціць за пражыванне ў кватэрах і за камунальныя паслугі.

Па звестках кампетэнтных крыніц, ужо кожны трэці кватаранаймальнік завінаваціўся дзяржаве па аплаце за кватэру. А ў агульнай колькасці доўг перад жыллёва-камунальнымі службамі дасягае штомесяц некалькіх мільярдаў рублёў.

Пакуль жыллёва-камунальныя службы прымаюць да такіх неплацельшчыкаў толькі меры папераджальнага характару і прысылаюць да іх пісьмы з ушчуваннямі. Але ўжо ў сакавіку, у прыватнасці ў Оршы, у адносінах да асабліва злосных неплацельшчыкаў плануецца адключэнне газу і вады.

Між тым, у суседняй Латвійскай Рэспубліцы, як паведамляе газета «Вячэрні Даўгаўпілс», тых, хто не жадае аплачваць жыллё, прымушаюць працаваць на свежым паветры — збіраць на вуліцах снег!

Уладзімір ШЫК.

«ПАДАГРАЮЦЦА» ШКОЛЫ АД АГЕНЬЧЫКУ

41 чалавек загінуў на пажарах у краіне за мінулы тыдзень. Амаль палову іх складаюць пенсіянеры, прычынай смерці якіх, у большасці выпадкаў, становяцца печы.

Гінуць людзі таксама пры неасцярожным курэнні ў нецвярозым стане. Толькі ў адной мінскай кватэры па гэтай прычыне згарэлі 4 чалавекі.

У сувязі з маразамі пачасціліся і выпадкі пажараў на сельгасаб'ектах, якія ўзнікаюць ад разагравання труб адкрытым полымем. Толькі за 3 дні ў рэспубліцы запалалі 4 цялятнікі, ферма і гусятнік. Удалося выратаваць з агню 542 галавы жывёлы і больш як 100 гусей.

Парушэнне правілаў пажарнай бяспекі прывяло да загаранняў на Мінскім аўтазаводзе і Ваўкавыскім заводзе ліцейнага абсталявання.

Дасталося і школам. Напрыклад, агнём была знішчана школа ў в. Пузыры Мядзельскага раёна. З-за перанагравання печы ўзнік пажар у школе в. Садовічы Лельчыцкага раёна. 30 дзяцей прыйшлося эвакуіраваць з СШ № 1 г. Ліды пасля чыйгосьці неасцярожнага абыходжання з агнём.

Усяго ж, паводле інфармацыі, атрыманай у Галоўным упраўленні ваенізаванай пажарнай службы МУС РБ, за мінулы тыдзень у краіне адбылося 370 пажараў, урон ад якіх склаў 1 млрд. 756 млн. рублёў. Агнём знішчана і пашкоджана 287 пабудоў, 7 галоў жывёлы, 11 тон грубых кармоў, 7 адзінак тэхнікі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РАГУЛЬ УЛАДКАВАЛІ, А ЛЮДЗЕЙ?

Поўнасцю апусцелі з-за адсутнасці кармоў жывёлагадоўчыя фермы ў саўгасе імя Раманава Бешанковіцкага раёна.

Як паведаміла абласная газета «Народнае слова», мясцовы райвыканком прыняў рашэнне аб перадачы жывёлы на пракорм у іншыя саўгасы і калгасы раёна. Даяркі ледзь не плакалі, калі забіралі іх рагуль яшчэ і таму, што людзям цяпер проста няма куды падзецца.

Калі так гаспадарнічаць, то недалёка і ў вёсцы да масавага беспрацоўя...

Уладзімір ШЫК.

Пасля прыняцця падаткаў бюджэт будзе накіраваны на дапрацоўку ва ўрад

14 лютага Вярхоўны Савет Беларусі прыступае да разгляду змяненняў у падатковае заканадаўства, пазней парламент павінен разгледзець і дзяржаўны бюджэт на 1996 год. На гэтую тэму карэспандэнт «Звязды» размаўляе са старшынёй Пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета па бюджэту, падатках, банках і фінансах Уладзімірам Башарымавым.

— Уладзімір Сямёнавіч, ці складана ідзе абмеркаванне падаткаў і бюджэту ў камісіях і фракцыях?

— Пасля пасяджэння парламента ў мінулую пятніцу некаторыя СМІ напісалі, што наша камісія не гатова прыступіць да разгляду змяненняў у падаткі. Гэта не зусім так. Мы былі падрыхтаваныя пачаць разгляд змен у законе аб падатку на прыбытак і інш., але справа ў тым, што ўсё яшчэ працягвалі і працягваюць цяпер паступаць папраўкі. Хоць быў устаноўлены тэрмін да 1 лютага 1996 года. Як звычайна, нашы дэпутаты ды і многія інстытуты, прадпрымальніцкія структуры доўга збіраліся, але ўсё ж унеслі каштоўныя папраўкі. Аднак у такіх умовах наша камісія працаваць не можа, яе штат абмежаваны, а кожная папраўка патрабуе пільнага разгляду, карэктыў — гэта займае 3-4 гадзіны працы. Калі я на сесіі заявіў аб гэтым і зазначыў, што мы спыняем прыём паправак, зноў хлынуў вал новых прапаноў... У панядзелак наша камісія сустракалася са старшынямі іншых камісій, вялася размова па ўсіх змяненнях, якія ўносяцца ў законы па падаткаабкладанню. Былі вельмі бурныя спрэчкі, але нам удалося іх узгадніць, і я мяркую, што на сесіі разгляд гэтага пытання пойдзе намнога хутчэй.

Калі вас цікавіць тая палітыка, якую праводзіць наша камісія ў галіне падаткаабкладання, то зазначу, што ўсе мы разумеем, што падаткі трэба мяняць, падатковы прэс трэба змяншаць. Аднак вядома, што гэты прэс стварыўся больш як чатыры гады і разбурыць яго за адзін-два тыдні не ўдасца. Але рабіць гэта трэба, бо няма ніякай зацікаўленасці ў паляпшэнні працы прадпрыемстваў — іх кіраўнікі разумеюць, што ўсё «з'ядуць» падаткі. Гэта неразумная палітыка, накіраваная толькі на палаўненне бюджэту ў гэтую хвіліну, а што будзе далей... Мне не падабаюцца заявы Мінфіна, маўляў, давайце пакінем падаткі такімі, як яны ёсць, а ўжо возьмемся за іх з новага года. Трэба выпраўляць гэтае становішча цяпер.

Другое вострае пытанне заключаецца ў тым, што ў нас шмат розных цэнтралізаваных пазабюджэтных фондаў — каля адзінаццаці, і на 1996 год у іх, паводле маіх разлікаў, намечана атрымаць каля 31 трыльёна рублёў. Гэта амаль палова ўсяго кансалідаванага бюджэту. А калі мы запыталі ў Мінфіна звесткі аб тым, як выкарыстоўваюцца гэтыя грошы, — нам адказу не далі, маўляў, яны не валодаюць такімі данымі. Гэта страшна, грошы выходзяць з-пад кантролю... Таму я цяпер стаўлю пытанне наконт памяншэння гэтых пазабюджэтных фондаў.

— У нашым падатковым заканадаўстве існуе вялікае колькасць т. зв. ускосных падаткаў, якія, у рэшце рэшт, уплываюць на рознічныя цэны тавараў і кладуцца на плечы пакупнікоў. Ці мяркуецца неяк скарэкціраваць гэтую палітыку?

— Падаткі павінны чытацца, павінны быць зразумелымі, не трэба ўводзіць у зман простых людзей, кіраўнікоў, што тыя ці іншыя падаткі іх не датычацца. Возьмем для прыкладу пазабюджэтны фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Усе як быццам паверылі, што калгасы і саўгасы не плацяць гэты падатак. Але гэта не так, бо гэты ж падатак плаціцца праз цану таго ж камбікорму, дызпаліва і г. д. І зразумела, што вялікую частку ад сённяшніх нашых надзвычай высокіх рознічных цэн складаюць падаткі.

— Скажыце, колькі ўсяго падаткаў прапаноўвае захаваць урад і колькі, на вашу думку, іх застанецца пасля разгляду ў Вярхоўным Савеце?

— Цяпер прадпрыемствы плацяць 28 відаў падаткаў, Кабінет Міністраў прапаноўвае пакінуць 11 падаткаў і 11 плацяжоў у цэнтралізаваныя фонды, а акрамя іх жа яшчэ ёсць і мясцовыя фонды, прычым я нават не магу сказаць, колькі іх... Цяпер мы разглядаем 11 гэтых падаткаў, прадугледжаных Законам аб бюджэце, Законам аб падатках і зборах. І тут, як я мяркую, нам трэба падабрацца да галоўнай крыніцы зла — пазабюджэтных фондаў. Усе паступленні ад прадпрыемстваў павінны ісці праз бюджэт, павінны кантралявацца, і Міністэрства фінансаў павінна патрабаваць справаздачу за кожную зрасходаваную капейку. У нас пакуль што гэтага няма.

— Кабінет Міністраў хоча мець больш паўнамоцтваў па ўстанаўленні ўзроўняў акцызаў, падаткаў на нерухомасць і г. д.

— І прычына для гэтага адна — неабходнасць больш аператыўна выконваць свае функцыі, зыходзячы з канкрэтнай эканамічнай сітуацыі. Быць можа ў нейкай ступені гэта і правільна, калі не будзе ніякага свавольства з боку ўрада. Але я мяркую, што і Вярхоўны Савет здольны аператыўна адрэагаваць на тыя ці іншыя змяненні ў эканамічнай сітуацыі. Хай урад прадстаўляе нам прапановы, і ў тыднёвы тэрмін, мяркую, мы зможам прыняць тую ці іншую пастанову. Не буду гаварыць, што ВС павінен забраць усе функцыі сабе — мы павінны дэлегаваць нейкую іх частку ў гэтых пытаннях і Кабінету Міністраў. Але толькі пад кантролем Вярхоўнага Савета.

— Уладзімір Сямёнавіч, пасля падаткаў вы будзеце разглядаць бюджэт. Гэтыя два пытанні ўзаемазвязаны...

— Так, было прапанавана шмат паправак па падатках, і я мяркую, што пасля таго, як мы прымем змяненні ў падатковае заканадаўства, мы павінны накіраваць праект бюджэту на дапрацоўку Кабінету Міністраў. У сувязі са зменамі ў падатках іншай стане даходная частка бюджэту, з якой трэба будзе суадносіць і расходы. У панядзелак мы дамовіліся з кіраўніцтвам Вярхоўнага Савета, што прыкладна на тыдзень вернем Кабінету Міністраў бюджэт на карэкціроўку і толькі пасля гэтага мы будзем разглядаць яго.

— Тым не менш, вы ўжо вывучылі прапановы ўрада па бюджэту, як вы іх ацэньваеце?

— Прапанаваны бюджэт выклікае многія пытанні, асабліва даходная яго частка. Чаму столькі на армію, што ўваходзіць у сістэму МУС, што такое расходы на знешнеэканамічную дзейнасць, якія прапануецца зацвердзіць у суме больш як 2 трыльёны рублёў? Можа, гэта ёсць пакрыццё страт, якія нясуць нашы таваравытворцы ад экспарту, — дык навошта нам такі экспарт... Мы маем намер вельмі сур'ёзна вывучыць расходную частку бюджэту і паспрабаваць унесці карэктывы...

— Як вы ацэньваеце прапановы бюджэтных расходаў на сацыяльныя праграмы?

— На мой погляд, наш бюджэт накіраваны ў першую чаргу на выкананне гэтых праграм, на іх ідзе больш за палову бюджэту.

Мы прывучылі насельніцтва за 70 апошніх гадоў да таго, што дзяржава нясе большую частку сацыяльных выдаткаў на сваіх плячах. Таму і трэба гэтыя праграмы скарачаць, але калі мы будзем гэта рабіць раптоўна, то могуць быць і сацыяльныя канфлікты. Трэба паступова прывучаць нашых людзей да думкі, што яны павінны самі клапаціцца пра свае даходы, пра сваё будучае. Аднак зразумела, што цяпер не адкінеш нашых пенсіянераў, якіх больш як 2 мільёны, не пакінеш іх перад гэтым рынкам... Але рэальна памяншэнне расходаў на сацыяльныя патрэбы ідзе.

— А не што прапануецца павялічыць расходы?

— Я разумею сэнс вашага пытання і хачу зазначыць, што мы добра вывучым расходы і на армію, і на КДБ, і на іншыя падобныя ведамствы...

— А як вы ацэньваеце прапанову стварэння рэзервовага фонду Прэзідэнта ў памеры больш як 300 мільярдаў?

— І Прэзідэнту, і прэм'ер-міністру гэты фонд патрэбны — на ўсякія непрадбачаныя сітуацыі, якія могуць здарыцца на працягу года. У прынцыпе, нам трэба разабрацца ў іншым: а чаму менавіта 1 працэнт, а чаму не 0,5 і не 2 працэнты?

(Заканчэнне на 3-й стар.).

У МІНІСТЭРСТВЕ АБАРОНЫ ДОЛАРЫ НЕ ЛІЧАЦЬ...

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь прадаставіла ў распараджэнне «Звязды» адно з апошніх сваіх рашэнняў. Яно называецца так: «Аб выніках праверкі расходавання валютных сродкаў Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь за перыяд з 1 ліпеня 1994 года па 1 снежня 1995 года».

Яшчэ ўчора гэты дакумент быў бы *ў абавязковым парадку* пазначаны грыфам *«Совершенно секретно»*. І, натуральна, з ім азнаёміліся б (прычым, толькі пад распіску!) адзінкі высокапастаўленых кіраўнікоў рэспублікі. Лічбы ж і факты, якімі б яны ні былі, так і засталіся б «дзяржаўным сакрэтам», «тайнай», за якой, паводле нашай нядаўняй ідэалогіі, нібыта так актыўна палявалі нашы ўяўныя ворагі і нядобразычлівцы... А яшчэ, лічылі ў вярхах, народу не трэба было ўсё гэта ведаць...

На шчасце, змяніліся часы. І сёння мы атрымалі, нарэшце, права і магчымасць ведаць калі не ўсё, дык многае з таго, што робіцца і дзеецца ў роднай Айчыне.

У рэдакцыі палічылі, што рашэнне Савета Кантрольнай палаты «Аб выніках праверкі расходавання валютных сродкаў Міністэрствам абароны...» ўяўляе цікавасць для чытачоў «Звязды». Таму і вырашылі мы апублікаваць яго з невялікімі, але істотнымі, скарачэннямі.

«Разгледзеўшы матэрыялы праверкі расходавання валютных сродкаў у Міністэрстве абароны Рэспублікі Беларусь за перыяд з 1 ліпеня 1994 года па 1 снежня 1995 года, Савет Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь адзначае, што кіраўніцтва міністэрства замест накіравання гэтых сродкаў на першачарговыя патрэбы, у тым ліку на будаўніцтва жылля для ваеннаслужачых, у парушэнне дзеючага заканадаўства займалася бязліцэнзійнай дзейнасцю, прадастаўляючы пад працэнты валютныя пазыкі, буйныя сумы сродкаў адцягваліся на рахункі камерцыйных банкаў па дагаворах дэпазіту, адсутнічаў належны кантроль за выкананнем умоў дагавораў на набыццё абсталявання і харчавання, не заўсёды вытрымліваліся каштарысныя прызначэнні, значныя сродкі расходаваліся на аплату замежных камандзіровак, набываліся дарагія аўтамабілі, не вёўся асобны ўлік даходаў і расходаў ад аказання паслуг, парушалася падатковае заканадаўства.

За правяраемы перыяд Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь на свой бягучы рахунак атрымала 10064,8 тыс. долараў ЗША і 286,2 тыс. нямецкіх марак, у тым ліку ў 1994 годзе — 5697,0 тыс. долараў ЗША і 209,9 тыс. нямецкіх марак, у 1995 годзе — 4367,8 тыс. долараў ЗША і 76,3 тыс. нямецкіх марак.

Асноўнай крыніцай фарміравання валютнага фонду Міністэрства абароны з'яўляўся продаж узбраення і ваеннай тэхнікі (звыш 90 працэнтаў). Рэалізацыю гэтай прадукцыі ажыццяўлялі прадпрыемствы «Белзнешэканомсервіс», «Белтэхэкспарт» і аб'яднанне «Беларусамежгандаль» на падставе права, прадастаўленага ім урадам рэспублікі. Акрамя гэтага, на валютны рахунак паступалі працэнты па дагаворах дэпазіту, сродкі за арэнду лятальных апаратаў, валютныя паступленні за навучанне курсантаў, мэтавыя сродкі з Германіі для Беларускага цэнтра перападрыхтоўкі былых ваеннаслужачых.

У адпаведнасці з распараджэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 красавіка 1994 г. № 388 Міністэрству абароны было дадзена права расходаваць атрыманую валюту на падставе і ў межах каштарысаў расходаў, зацверджаных на 1994-1995 гады на фінансаванне Узброеных Сіл, звыш асігнаванняў, прадугледжаных у бюджэце на абарону, аднак валютныя сродкі выкарыстоўваліся на іншыя мэты.

Так, 12 красавіка 1995 года, пры наяўнасці нявернутай запазычанасці па пазыцы ад 10 лістапада 1993 года ў суме 3480 долараў ЗША, начальнік упраўлення ваеннага бюджэту і эканомікі Міністэрства абароны палкоўнік М. А. Чачуха падпісаў дагавор пазыкі з магазінам «Аўтамабілі» на суму 200 тыс. долараў ЗША тэрмінам да 10 лістапада 1995 года. Гэты дагавор быў падпісаны на падставе пісьма дырэктара фірменнага магазіна «Аўтамабілі» В. П. Голада ад 11 красавіка 1995 г. № 56 з просьбай аб выдзяленні валютнай пазыкі, узгодненага з былым міністрам абароны А. І. Кастэнкам. Дагавор быў заключаны ў парушэнне п.1.3. Палажэння Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 1 красавіка 1994 г. № 302 «Аб парадку правядзення валютных аперацый, звязаных з рухам капіталу», пры адсутнасці ліцэнзіі на правядзенне аперацый з валютным капіталам, а таксама ўмоў выкарыстання валютных сродкаў, прадугледжаных распараджэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 красавіка 1994 г. № 388.

У парушэнне ўмоў заключанага дагавора пералічэнне сродкаў было праведзена не магазіну «Аўтамабілі», а фірмам-пастаўшчыкам, у тым ліку 21 красавіка 1995 года ў памеры 70 тыс. долараў ЗША Маскоўскаму аддзяленню фірмы «Сабор Карпарэйшн», 5 мая 1995 года ў памеры 130 тыс. долараў ЗША — фірме «Юнік Інвестмент Груп». Расходы Міністэрства абароны на пераход гэтых сум склалі 360 долараў ЗША, якія, згодна з п.1.4. дагавора, павінен быў аплаціць пазычальнік, гэта значыць магазін «Аўтамабілі». У дагаворы не былі прадугледжаны гарантыі вяртання пазыкі або яе фінансавага забеспячэння маёмасцю магазіна «Аўтамабілі» пры неяўтанні грошай. Пералічэнне валюты было праведзена пад дагавор № 299/1 ад 30 лістапада 1994 г., да якога Міністэрства абароны не мела ніякага дачынення, паколькі заключаны ён быў ад імя магазіна «Аўтамабілі». Па ўмовах заключанага дагавора пазыкі магазін «Аўтамабілі» павінен быў аплаціць 30 працэнтаў сумы пазыкі за карыстанне валютай або пастаўіць Міністэрству абароны аўтамабілі на суму належных працэнтаў.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ у камерцыйных банках на 13 лютага 1996 г.

Назва банка	Долар ЗША Купля	Долар ЗША Продаж	Нямецкая марка Купля	Нямецкая марка Продаж	Расійскі рубель Купля	Расійскі рубель Продаж	Тэлефоны
Белбізнесбанк (гал. аперац. упраў.)	11800	12100	7850	8150	2.30	2.50	067
Белбізнесбанк (гарадская дырэкцыя)	11650	11950	7800	8100	2.25	2.55	
Белзнешэканомбанк	Інфармацыя на 9.50 не атрымана						267-022
ФК «Веранікa»*** (за расійскія рублі)	11850 4780	11950 4880	7900	8100	2.45	2.52	531-504
Ф-л 0104 АКБ «Мінскій транзітны банк»	11650	12100	7600	8050	2.00	2.50	372-825
Народны банк	11800	12000	8000	8200	2.35	2.50	238-610
«Алімп»	11850	12150	7900	8200	2.45	2.56	508-556
Ф-л № 1 АКБ «Алімп»	11800	12000	7800	8100	2.35	2.48	291-646, 067
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	11500		7766.60		2.43		
Цэнтрабанк Расіі	4738		3201.14		100 бел.р. 38.90		

*** — Аперацыя з валютай больш за 1000$ праводзіцца на дагаворных умовах

Агенцтва Граўцова

ДА «ДЗІЦЯЧАГА ПЫТАННЯ» ВА ЎРАДЗЕ АДНОСЯЦЦА СУР'ЁЗНА

Выкананне Закона «Аб правах дзіцяці» і «Нацыянальнага плана дзеянняў па абароне правоў дзіцяці на 1995—2000 гады» стала тэмай каардынацыйнай нарады ў віцэ-прэм'ера Уладзіміра Русакевіча, якая адбылася 12 лютага. У ёй прынялі ўдзел кіраўнікі аблвыканкамаў, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, адказных за выкананне гэтага закона, а таксама прадстаўнікі грамадскіх дзіцячых і маладзёжных арганізацый і фондаў.

З выступленняў усіх дакладчыкаў Уладзімір Русакевіч зрабіў несуцяшальную выснову: дзеці ў нашым грамадстве знаходзяцца пакуль у дрэнным становішчы. Як аблегчыць яго і якія меры неабходна прыня

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь

Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь

Пасланне Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь

АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 1995 ГОДЗЕ

Аналіз сітуацыі, што склалася ў Рэспубліцы Беларусь у 1995 годзе, сведчыць аб тым, што крызіс, які ахапіў практычна ўсе сферы грамадства, не быў пераадолены. Працягваўся спад вытворчасці, знижаўся жыццёвы ўзровень большасці насельніцтва. Абвастрылася крымінагенная абстаноўка. Правы і свабоды грамадзян, абвешчаныя Канстытуцыяй і законамі, забяспечваліся не ў поўнай меры.

Парламенцкі крызіс, які зацягнуўся, прывёў да таго, што ў рэспубліцы нейкі час фактычна не функцыянаваў Вярхоўны Савет — вышэйшы прадстаўнічы і адзіны заканадаўчы орган дзяржаўнай улады. Па гэтай прычыне быў паралізаваны заканатворчы працэс, аслаблены кантроль за выкананнем законаў. На практыцы законы сталі падмяняцца падзаконнымі актамі. Парушаўся канстытуцыйны прынцып падзелу ўладаў, не было належнага ўзаемадзеяння паміж заканадаўчай і выканаўчай уладамі.

Гэты і іншыя фактары негатыўна ўплывалі на фарміраванне ў рэспубліцы асноў прававой дзяржавы, абвешчанай Канстытуцыяй.

У такіх умовах Канстытуцыйны суд ажыццяўляў дзейнасць па абароне канстытуцыйнага ладу, забеспячэнню вяршэнства Канстытуцыі, сцвярджэнню канстытуцыйнай законнасці ў рэспубліцы.

I

У 1995 г. Судом праверана на прадмет адпаведнасці Канстытуцыі 26 нарматыўных актаў, у тым ліку 7 законаў, 2 пастановы Вярхоўнага Савета, 14 указаў Прэзідэнта і 3 пастановы ўрада. Ініцыятарамі разгляду спраў з'яўляліся: Старшыня Вярхоўнага Савета — па 7 справах, дэпутаты Вярхоўнага Савета — па 3, Прэзідэнт — па 2, Вярхоўны суд, Вышэйшы гаспадарчы суд, в. а. Генеральнага пракурора — па 3. Дзве справы Канстытуцыйны суд узбудзіў па ўласнай ініцыятыве. Прызнаны неадпаведнымі Канстытуцыі поўнасцю ці часткова 16 нарматыўных актаў: 4 законы, 1 пастанова Вярхоўнага Савета і 11 указаў Прэзідэнта.

Больш як палову спраў склалі справы, якія датычаць абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

Пры разглядзе справы аб адпаведнасці Канстытуцыі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 красавіка 1992 г. № 186 «Аб дзяржаўных каштоўных паперах былога Саюза ССР» і ад 5 сакавіка 1993 г. № 125 «Аб выкупе аблігацый мэтавай беспрацэнтнай пазыкі 1990 года на набыццё тавараў працяглага карыстання» Суд прызнаў, што дзяржава неабгрунтавана адмовілася выканаць узятыя ёю на сябе абавязацельствы ў адносінах да грамадзян—уладальнікаў аблігацый указанай пазыкі, якія не згадзіліся на прапанаваныя ўмовы іх пагашэння. Тым самым былі парушаны не толькі асноватворныя нормы грамадзянскага заканадаўства, але і канстытуцыйны прынцып узаемнай адказнасці дзяржавы і грамадзяніна.

Указам Прэзідэнта ад 1 верасня 1995 г. № 350 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання працоўнай дзейнасці і пенсіённага забеспячэння грамадзян» са змяненнямі і дапаўненнямі, унесенымі ў яго ўказамі ад 11 кастрычніка 1995 г. № 419 і ад 20 кастрычніка 1995 г. № 437, абмяжоўвалася права значнай колькасці працуючых пенсіянераў на атрыманне поўнай пенсіі і прадугледжвалася перавесці іх на абавязковую кантрактную форму найму.

Праверыўшы канстытуцыйнасць гэтых указаў, Суд прызнаў іх не адпаведнымі Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь як у частцы абмежавання правоў працуючых пенсіянераў на атрыманне поўнай пенсіі, так і ў частцы абавязковага заключэння з імі кантрактаў.

Канстытуцыйны суд выказаўся ў абарону грамадзянскіх і палітычных правоў і свабод грамадзян па справе аб канстытуцыйнасці Указа Прэзідэнта ад 21 жніўня 1995 г. № 336 «Аб некаторых мерах па забеспячэнню стабільнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь».

Гэтым указам была спынена дзейнасць Свабоднага прафсаюза і первічнай прафсаюзнай арганізацыі Мінскага метрапалітэна Прафсаюза чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў Рэспублікі Беларусь; пракуратуры прадпісвалася ўнесці ў суды прадстаўленні аб забароне дзейнасці гэтых прафсаюзных арганізацый; прадугледжвалася, што ўдзел палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў у забастоўках на прадпрыемствах, уключаных у Пералік, зацверджаны пастановай Кабінета Міністраў ад 28 сакавіка 1995 г. № 158, цягне спыненне іх дзейнасці. Акрамя таго, указам прыпынялася дзеянне нормаў законаў, якія датычаць недатыкальнасці дэпутатаў Вярхоўнага і мясцовых Саветаў.

Суд прызнаў, што ўказаныя меры супярэчаць Канстытуцыі, законам Рэспублікі Беларусь, Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, Канвенцыі Міжнароднай арганізацыі працы «Аб свабодзе асацыяцый і абароне права на арганізацыю», ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь.

Указам Прэзідэнта ад 1 верасня 1995 г. № 349 «Аб упарадкаванні некаторых ільгот для асобных катэгорый грамадзян» прыпынена прадастаўленне ільгот і перавяг, устаноўленых васемнаццаццю законамі («Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», «Аб ветэранах», «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў», «Аб міліцыі» і інш.). Гэтыя льготы і перавагі датычылі бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце, 50-працэнтнай скідкі па аплаце жылля і камунальных паслуг, выдачы беспрацэнтных пазык на будаўніцтва ці набыццё жылля і дачных домікаў, бясплатнага набыцця па рэцэптах урачоў лякарстваў і г. д.

Прааналізаваўшы нормы Канстытуцыі, законаў, міжнародна-прававых актаў, Суд прыйшоў да высновы, што, прыпыніўшы сваім указам прадастаўленне льгот і перавяг, прадугледжаных законамі, Прэзідэнт тым самым узяў на сябе функцыі органа заканадаўчай улады, чым перавысіў свае паўнамоцтвы.

З абаронай працоўных грамадзян звязана справа аб адпаведнасці Канстытуцыі і законам указа Прэзідэнта ад 13 ліпеня 1995 г. № 271 «Аб аплаце працы службовых асоб некаторых дзяржаўных органаў».

Суд вырашыў, што ўстанаўленне гэтым указам новых памераў заработнай платы службовым асобам вышэйшых органаў дзяржаўнай улады (Старшыні Вярхоўнага Савета, яго намеснікам, старшыням дэпутацкіх камісій, дэпутатам Вярхоўнага Савета, якія працуюць на прафесіянальнай аснове, Генеральнаму пракурору, старшыням Вярхоўнага суда, Вышэйшага гаспадарчага суда, Канстытуцыйнага суда і інш.), не стасуецца з палажэннямі Канстытуцыі і законаў аб Вярхоўным Савеце, аб судовым ладзе і статусе суддзяў, аб Канстытуцыйным судзе, аб Кабінеце Міністраў, аб пракуратуры.

Акрамя таго, Суд адзначыў, што гэты ўказ не быў апублікаваны і не даведзены да ўсеагульнага ведама іншым прадугледжаным законам спосабам, што супярэчыць Канстытуцыі і ўказу Прэзідэнта ад 3 снежня 1994 г. № 252 «Аб парадку апублікавання і ўступлення ў сілу ўказаў і распараджэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Па ініцыятыве дэпутатаў Вярхоўнага Савета, якія паставілі пытанне аб манапалізацыі сродкаў масавай інфармацыі, Судом на прадмет канстытуцыйнасці праверана тры ўказы Прэзідэнта (ад 4 жніўня 1994 г. № 19, ад 5 жніўня 1994 г. № 27 і ад 28 верасня 1994 г. № 128), якія датычалі дзейнасці выдавецтва «Беларускі Дом друку» і Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. Суд устанавіў, што выдавецтва «Беларускі Дом друку» займае дамінуючае становішча на рынку газетнай прадукцыі. Злоўжыванне гэтым становішчам з боку некаторых службовых асоб дзяржаўных органаў прывяло да выхаду ў снежні 1994 г. некаторых газет з «белымі плямамі», чым было парушана канстытуцыйнае права грамадзян на атрыманне поўнай, праўдзівай і своечасовай інфармацыі. Негатыўныя вынікі такога становішча мелі месца і ў 1995 г., калі з парушэннем устаноўленага парадку выдавецтвам «Беларускі Дом друку» былі скасаваны дагаворы з шэрагам недзяржаўных выданняў, што прымусіла іх шукаць паліграфічную базу за межамі рэспублікі.

Суд таксама прыйшоў да высновы, што Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія з'яўлялася не толькі сродкам масавай інфармацыі, займаючы дамінуючае становішча ў сферы тэлерадыёвяшчання, але і была надзелена функцыямі цэнтральнага органа дзяржаўнага кіравання. Гэта прывяло фактычна да ўстанаўлення яе манополіі ў сферы электронных сродкаў масавай інфармацыі.

На гэтай падставе Суд прызнаў асобныя нормы Палажэння аб Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, зацверджанага ўказам Прэзідэнта ад 28 верасня 1994 г. № 128, супярэчным Канстытуцыі, якая забараняе манапалізацыю сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі ці асобнымі грамадзянамі.

Указам Прэзідэнта ад 19 кастрычніка 1995 г. № 429 у Палажэнне аб Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі ўнесены змяненні і дапаўненні, якія не ліквідуюць поўнасцю адзначаныя Судом парушэнні Канстытуцыі і законаў.

Вялікі грамадскі рэзананс выклікала справа аб канстытуцыйнасці Пастановы Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 12 жніўня 1994 г. № 15/1 «Аб дэнамінацыі беларускага рубля». Суд, прызнаўшы пастанову адпаведнай Канстытуцыі, разам з тым прапанаваў Прэзідэнту, Вярхоўнаму Савету, Кабінету Міністраў і Нацыянальнаму банку распрацаваць і ажыццявіць меры, накіраваныя на кампенсацыю насельніцтву ўрону, нанесенага ў выніку інфляцыйнага абясцэньвання грашовых зберажэнняў, укладзеных у Ашчадны банк. Пры гэтым Канстытуцыйны суд прапанаваў выкарыстаць магчымасці маёмаснай кампенсацыі шляхам бясплатнай ці на льготных умовах прыватызацыі жылля, зямельных участкаў, выпуску акцый, аблігацый дзяржаўнай пазыкі і іншых спосабаў абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян.

У радзе сваіх рашэнняў Канстытуцыйны суд звярнуў увагу на неабходнасць захавання прынцыпу падзелу ўладаў, у адпаведнасці з якім дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя, узаемадзейнічаюць паміж сабой, стрымліваюць і ўраўнаважваюць адзін аднаго.

Разгледзеўшы справу аб адпаведнасці Канстытуцыі артыкула 7 Закона «Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь», асобных артыкулаў Часовага рэгламенту Вярхоўнага Савета, Суд прыйшоў да высновы, што Канстытуцыя не дапускае такой сітуацыі, калі адсутнічае вышэйшы прадстаўнічы і адзіны заканадаўчы орган улады, якім з'яўляецца Вярхоўны Савет. Грунтуючыся на Канстытуцыі і Законе аб парадку ўступлення ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Суд прызнаў, што Вярхоўны Савет дванаццатага склікання меў права ажыццяўляць свае паўнамоцтвы да першага пасяджэння Вярхоўнага Савета трынаццатага склікання, выбранага ў правамоцным саставе.

Суд прыйшоў да высновы аб неадпаведнасці Канстытуцыі і Законам аб бюджэтнай сістэме, аб Вярхоўным Савеце, аб Прэзідэнце, аб Кабінеце Міністраў, аб бюджэце рэспублікі на 1995 год і іншым законам Указа Прэзідэнта ад 12 ліпеня 1995 г. № 267 «Аб удакладненні бюджэту Рэспублікі Беларусь на 1995 год і часовых мерах па скарачэнню бюджэтных расходаў». Гэтым указам уносіліся ўдакладненні ў даходную і расходную часткі бюджэту, у сумы датацый у мясцовыя бюджэты вобласцей і горада Мінска, прыпынялася прадастаўленне ільгот па падаходнаму падатку ваеннаслужачым, супрацоўнікам органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, прадпісвалася Міністэрству адукацыі і навукі перавесці сетку вячэрніх класаў пры дзённых школах на платную аснову навучання.

У сваім рашэнні Суд указаў, што ніякія меркаванні мэтазгоднасці не могуць быць прызнаны прыярытэтнымі ў адносінах да Канстытуцыі, у адпаведнасці з якой змяненні ў рэспубліканскі бюджэт мае права ўносіць толькі Вярхоўны Савет і толькі ў форме закона.

Пытанні дакладнага размежавання паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета і Прэзідэнта, а таксама вызначэння іх месца ў сістэме органаў дзяржаўнай улады былі разгледжаны Судом пры праверцы канстытуцыйнасці законаў аб Вярхоўным Савеце і аб Прэзідэнце. Суд прызнаў не адпаведнымі Канстытуцыі асобныя палажэнні Закона аб Вярхоўным Савеце, у прыватнасці, вызначэнне статусу Вярхоўнага Савета звычайнымі законамі; ажыццяўленне Вярхоўным Саветам паўнамоцтваў уласніка ў адносінах да ўласнасці Рэспублікі Беларусь; прыняцце Вярхоўным Саветам без галасавання пастановы аб адстаўцы Прэзідэнта; надзяленне Прэзідыума Вярхоўнага Савета правам разглядаць не толькі пытанні арганізацыі і забеспячэння дзейнасці Вярхоўнага Савета, але і аналагічныя пытанні ў адносінах да Кантрольнай палаты, пракуратуры і іншых органаў, ствараемых Вярхоўным Саветам і падпарадкаваных яму; распаўсюджанне дэпутацкай недатыкальнасці на былых дэпутатаў; ажыццяўленне Вярхоўным Саветам кантролю за дзейнасцю органаў мясцовага кіравання і самакіравання, не звязанай з выкананнем імі заканадаўства.

Судом устаноўлена неканстытуцыйнасць некаторых нормаў Закона аб Прэзідэнце. Сярод іх такія, як датэрміновае спыненне паўнамоцтваў Прэзідэнта ў выніку недаверу, выказанага яму на рэферэндуме; пераход паўнамоцтваў Прэзідэнта да Старшыні Вярхоўнага Савета з моманту заключэння Канстытуцыйнага суда ад парушэнні Канстытуцыі Прэзідэнтам або спецыяльнай камісіі аб учыненні Прэзідэнтам злачынства; прызнанне ў якасці падставы для датэрміновага вызвалення Прэзідэнта ад пасады па стану здароўя ў выпадку адмовы Прэзідэнта ад урачэбнага медыцынскага агляду; права Прэзідэнта ўносіць у Вярхоўны Савет прапановы аб вызваленні ад пасад старшынь Вярхоўнага суда, Вышэйшага гаспадарчага суда, Канстытуцыйнага суда, праўлення Нацыянальнага банка; ажыццяўленне Саветам бяспекі па рашэнню Вярхоўнага Савета функцый дзяржаўнай улады і кіравання пры ўвядзенні надзвычайнага становішча.

Канстытуцыйны суд лічыць, што наяўнасць законаў аб Вярхоўным Савеце і аб Прэзідэнце дазваляе дакладна вызначыць сферы дзейнасці вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і забяспечыць эфектыўнае ўзаемадзеянне іх паміж сабой, як таго патрабуе Канстытуцыя.

Актуальнымі ў мінулым годзе заставаліся пытанні функцыянавання сістэмы органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

Указам Прэзідэнта ад 19 верасня 1995 г. № 383 «Аб правядзенні рэформы органаў мясцовага кіравання і самакіравання» ліквідаваны раённыя ў гарадах Саветы дэпутатаў і іх органы. На тэрыторыі гэтых раёнаў утвораны мясцовыя адміністрацыі, якія сталі правапераемнікамі выканаўчых камітэтаў раённых Саветаў дэпутатаў. Гэтым жа ўказам было прыпынена правядзенне выбараў у раённыя ў гарадах Саветы дэпутатаў. Наступнымі ўказамі Прэзідэнта ад 27 лістапада 1995 г. № 481 і ад 30 лістапада 1995 г. № 485 зацверджана прыкладная структура мясцовай адміністрацыі і ўнесены змяненні і дапаўненні ў Часовае палажэнне аб мясцовай адміністрацыі.

Разгледзеўшы гэтыя ўказы, Суд вырашыў, што ліквідацыя раённых у гарадах Саветаў дэпутатаў і іх органаў і стварэнне на тэрыторыі раёнаў у гарадах мясцовых адміністрацый супярэчаць Канстытуцыі і Закону аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, а прыпыненне правядзення выбараў у раённыя ў гарадах Саветы дэпутатаў — Канстытуцыі і Закону аб выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Прадметам разгляду Суда была таксама справа аб канстытуцыйнасці Закона аб унясенні дапаўнення ў Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь». Канстытуцыйны суд прызнаў, што замацаванне на заканадаўчым узроўні палажэння аб тым, што паўнамоцтвы мясцовых Саветаў захоўваюцца да адкрыцця першых пасяджэнняў адпаведных мясцовых Саветаў дэпутатаў новага склікання не супярэчыць Канстытуцыі.

Усе рашэнні Канстытуцыйнага суда, як указаныя ў гэтым Пасланні, так і па іншых разгледжаных справах, былі апублікаваны ў друку.

II

Сур'ёзную заклапочанасць выклікае невыкананне прынятых Канстытуцыйным судом рашэнняў.

Законам аб Канстытуцыйным судзе прадугледжана, што рашэнні Суда абавязковыя для выканання ўсімі дзяржаўнымі органамі, прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі. Невыкананне, неналежнае выкананне ці перашкоджанне выкананню рашэнняў Канстытуцыйнага суда цягне адказнасць, устаноўленую законам. Аднак спецыяльнага закона, які б прадугледжваў такую адказнасць, няма. Гэта з'яўляецца адной з прычын таго, што рашэнні Канстытуцыйнага суда, як правіла, не выконваюцца.

Да гэтага часу Вярхоўным Саветам не ўнесены змяненні і дапаўненні ў Закон «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» і ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, прапанаваныя ў рашэннях Суда ад 17 кастрычніка і ад 19 снежня 1994 г.

Вярхоўнаму Савету неабходна на аснове рашэнняў Канстытуцыйнага суда ўнесці змяненні і дапаўненні ў законы аб Вярхоўным Савеце і аб Прэзідэнце, а таксама ў Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 13 красавіка 1995 г. «Аб тлумачэнні пункта 4 часткі першай Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб асновах службы ў дзяржаўным апараце».

Кабінетам Міністраў не выканана рашэнне Суда па справе «Аб адпаведнасці Канстытуцыі пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 красавіка 1992 г. № 186 «Аб дзяржаўных каштоўных паперах былога Саюза ССР» і ад 5 сакавіка 1993 г. № 125 «Аб выкупе аблігацый мэтавай беспрацэнтнай пазыкі 1990 года на набыццё тавараў працяглага карыстання», а таксама не прынята канкрэтных мераў па рэалізацыі прапаноў Суда, якія змяшчаліся ў яго рашэнні аб канстытуцыйнасці Пастановы Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 12 жніўня 1994 г. № 15/1 «Аб дэнамінацыі беларускага рубля».

Застаюцца да гэтага часу нявыкананымі рашэнні Суда, якія прызналі поўнасцю або часткова не адпаведнымі Канстытуцыі 11 указаў Прэзідэнта, выдадзеных у 1994—1995 гадах. Больш таго, 29 снежня 1995 г. Прэзідэнт выдаў распараджэнне, якім прадпісваў Кабінету Міністраў і іншым дзяржаўным органам забяспечыць захаванне нормаў указаў, раней прызнаных Судом неканстытуцыйнымі. Тым самым праяўлена непавага да Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь.

III

Адным з важных паказчыкаў стану канстытуцыйнай законнасці з'яўляюцца звароты грамадзян і юрыдычных асоб у Канстытуцыйны суд, колькасць якіх працягвае няўхільна расці. Калі ў 1994 г. паступіла каля 300 зваротаў, то ў 1995 г. — больш як 800.

Найбольшая колькасць скаргаў датычала ільгот і пераваг, якіх былі пазбаўлены асобныя катэгорыі грамадзян указам Прэзідэнта ад 1 верасня 1995 г. № 349, а таксама абмежаванняў правоў непрацуючых пенсіянераў на атрыманне поўнай пенсіі і ўвядзення для іх абавязковай кантрактнай формы найму, прадугледжаных указам Прэзідэнта ад 1 верасня 1995 г. № 350.

Многія грамадзяне скардзяцца на непрыняцце мераў па кампенсацыі ўрону, прычыненага абясцэньваннем грашовых укладаў у Ашчадным банку, а таксама на невыкананне дзяржавай пазыковых абавязацельстваў па пагашэнню аблігацый мэтавай беспрацэнтнай пазыкі 1990 года на набыццё тавараў працяглага карыстання.

У Канстытуцыйны суд паступаюць таксама скаргі, не звязаныя з яго рашэннямі. У асноўным гэта скаргі па пытаннях жыллёвых правоў, пенсіённага забеспячэння, несвоечасовай выплаты зарплаты, збірання дзяржаўнай пошліны пры звяртанні ў суд па абарону працоўных і іншых правоў грамадзян.

Юрыдычныя асобы ў сваіх зваротах у суд адзначаюць недахопы гаспадарчага і перш за ўсё падатковага заканадаўства, наяўнасць вялікай колькасці падзаконных нарматыўных актаў, няўзгодненых адзін з адным і часта супярэчных закону, немагчымасць у шэрагу выпадкаў знайсці належную судовую абарону.

Павелічэнне патоку скаргаў у Канстытуцыйны суд, адлюстроўваючы аб'ектыўныя цяжкасці ў сацыяльна-эканамічным становішчы рэспублікі, у той жа час сведчыць аб недасканаласці дзеючага заканадаўства і аб нездавальняючай арганізацыі разгляду скаргаў некаторымі органамі выканаўчай і судовай улады.

У сувязі з гэтым Канстытуцыйны суд лічыць неабходным прыняць закон аб зваротах грамадзян, аб распрацоўцы якога ўказвалася ў Пасланні аб стане канстытуцыйнай законнасці ў рэспубліцы ў 1994 годзе.

IV

Канстытуцыйны суд лічыць, што стан канстытуцыйнай законнасці ў рэспубліцы не можа быць прызнаны здавальняючым.

Прынцып падзелу ўладаў не атрымаў належнага ўвасаблення на практыцы. У выніку неправамернага ўзмацнення выканаўчай улады прыніжалася роля і значэнне іншых галін улады. У шэрагу выпадкаў законы падмяняліся супярэчнымі ім падзаконнымі актамі. Гэта штурхала службовых асоб на парушэнне закона і дазарыентавала грамадзян, параджаючы прававы нігілізм.

Суд адзначае, што такое становішча склалася ў пэўнай меры з прычыны ігнаравання выканаўчай уладай Вярхоўнага Савета дванаццатага склікання ў апошні перыяд яго дзейнасці і адвольнага тлумачэння пункта 1 артыкула 100 Канстытуцыі. На думку Суда, гэта норма не можа тлумачыцца як аўтаномная, адарваная ад іншых нормаў Канстытуцыі, што дае Прэзідэнту якія-небудзь «надзвычайныя паўнамоцтвы». На ўказаную акалічнасць Суд неаднаразова звяртаў увагу ў сваіх рашэннях па канкрэтных справах.

Процістаянне выканаўчай і заканадаўчай уладаў прывяло да парушэння прынцыпу вяршэнства закона, згодна з якім дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы звязаны правам, дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй законаў.

У гэтых умовах рашэнні Канстытуцыйнага суда па забеспячэнню канстытуцыйнай законнасці сталі прычынай для сістэматычнага і мэтанакіраванага ціску, аказваемага на суд, што ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Законам аб Канстытуцыйным судзе з'яўляецца недапушчальным. Ажыццяўлялася спробы абвінаваціць Суд у дэстабілізацыі абстаноўкі. Больш таго, у апошні час праз сродкі масавай інфармацыі пачала праводзіцца ідэя аб ліквідацыі Канстытуцыйнага суда. Гэта памылковая ідэя супярэчыць прынцыпам дэмакратычнай прававой дзяржавы і сусветнаму вопыту дзяржаўнага будаўніцтва.

У многім застаюцца дэкларатыўнымі нормы Канстытуцыі, якія гарантуюць правы і свабоды грамадзян, у тым ліку правы на абарону сваіх эканамічных і сацыяльных інтарэсаў, на працу і на ўзнагароджанне за выкананую работу, на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, на ўдзел у вырашэнні дзяржаўных спраў як непасрэдна, так і праз свабодна выбраных прадстаўнікоў, на атрыманне поўнай, праўдзівай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў. Разам з эканамічнымі і іншымі прычынамі ўзніклае становішча тлумачыцца недасканаласцю законаў, адсутнасцю належных механізмаў іх рэалізацыі, а таксама недастаткова эфектыўнай судовай абаронай правоў і свабод грамадзян.

Частка нарматыўных актаў, якія датычаць правоў чалавека, як і раней, уводзіцца ў дзеянне без іх апублікавання ці давядзення да ўсеагульнага ведама іншым прадугледжаным законам спосабам.

Трэба прызнаць, што дзеючае заканадаўства з-за аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын марудна прыводзіцца ў адпаведнасць з Канстытуцыяй і агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права, застаючыся ў значнай частцы супярэчлівым і не адпаведным патрэбам сённяшняга дня.

На стане канстытуцыйнай законнасці адмоўна адбіваецца недасканала ролі права ў дзяржаўным і грамадскім жыцці. У свядомасць грамадзян укараняецца лжывая думка аб дзяленні законаў на «дрэнныя» і «добрыя» і вынікаючым адсюль «правам» не выконваць «дрэнныя». Не выхоўваюцца лаваўлівыя адносіны да Канстытуцыі і законаў, слаба прапагандуюцца прынцыпы дэмакратычнай прававой дзяржавы.

На многія з указаных акалічнасцей Суд звярнуў увагу ў сваім пасланні аб стане канстытуцыйнай законнасці ў рэспубліцы ў 1994 годзе. Аднак належнага рэагавання на яго з боку Прэзідэнта і Вярхоўнага Савета не адбылося.

У мэтах забеспячэння канстытуцыйнай законнасці, рэальнай абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, усталявання прынцыпаў дэмакратычнай прававой дзяржавы Канстытуцыйны суд уносіць наступныя прапановы.

1. Для збалансавання дзейнасці заканадаўчай і выканаўчай уладаў унесці ў Законы аб Прэзідэнце, аб Вярхоўным Савеце і іншыя нарматыўныя акты змяненні і дапаўненні ў адпаведнасці з прынятымі па іх рашэннямі Канстытуцыйнага суда, даць тлумачэнне пункта 1 артыкула 100 Канстытуцыі.

2. Зыходзячы з прынцыпу вяршэнства закона, на падставе рашэнняў Канстытуцыйнага суда разгледзець пытанні, вырашаныя ва ўказах Прэзідэнта, якія прызнаны поўнасцю або часткова не адпаведнымі Канстытуцыі.

3. Улічваючы, што згодна з Канстытуцыяй чалавек з'яўляецца вышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы, лічыць абарону правоў і свабод грамадзян важнейшым напрамкам дзейнасці заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады.

Павысіць ролю суда як асноўнага гаранта абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян. Прыняць меры па далейшай рэалізацыі Канцэпцыі судова-прававой рэформы, прынятай Вярхоўным Саветам 23 красавіка 1992 года.

Устанавіць у рэспубліцы пасаду ўпаўнаважанага па правах чалавека.

4. Прызнаць недапушчальным прымяненне нарматыўных актаў, якія датычаць правоў чалавека, да іх апублікавання ці давядзення да ўсеагульнага ведама іншым прадугледжаным законам спосабам.

5. Распрацаваць праграму падрыхтоўкі новых законаў і перагляду дзеючых з мэтай прывядзення ў адпаведнасць з Канстытуцыяй і агульнапрызнанымі прынцыпамі міжнароднага права.

У першачарговым парадку рэфарміраваць грамадзянскае і крымінальнае заканадаўства з мэтай стварэння сучаснай прававой асновы развіцця рыначных адносінаў і ўзмацнення барацьбы со злачынасцю.

Для ўдасканалення арганізацыі заканатворчай дзейнасці падрыхтаваць і прыняць закон, у якім прадугледзець парадак падрыхтоўкі, прыняцця, уступлення ў сілу і спынення дзеяння законаў і іншых нарматыўных актаў.

6. Унесці дапаўненні ў Канстытуцыю і ў Закон аб Канстытуцыйным судзе, прадаставіўшы права Суду тлумачыць Канстытуцыю. Прадугледзець магчымасць разгляду Судом на прадмет канстытуцыйнасці ўсіх прававых актаў вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, а таксама скаргаў грамадзян на парушэнне іх канстытуцыйных правоў і свабод. Устанавіць адказнасць за невыкананне рашэнняў Канстытуцыйнага суда.

Канстытуцыйны суд выказвае надзею, што змешчаныя ў Пасланні прапановы знойдуць разуменне і падтрымку Прэзідэнта і Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Гэта пасланне прынята ў адпаведнасці з артыкулам 44 Закона «Аб Канстытуцыйным судзе Рэспублікі Беларусь» і артыкулам 81 Рэгламенту Канстытуцыйнага суда на пасяджэнні Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь 9 лютага 1996 года.

Старшынствуючы — старшыня Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь В. Г. ЦІХІНЯ.

СВЕТАГЛЯД

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

АПОШНІ СНЕГ

Ад болю пабялелая палата,
З якой бяда даўно прагнала смех...
«Які гадок табе, сынок?» «Дзесяты...»
Ляжыць хлапчук без мамы і без таты,
А за вакном ідзе калядны снег.

Снег сыдзе,
і тады зямлю пабудзяць
Бурклівы гром,
смяшлівае лісцё.
І будзем мы,
але скажыце,
людзі,
Куды падзець мне гэткае жыццё,
Калі вачмі тугі
душа працята
Калі свідруе думка галаву,
Што не дагоніць раўчуком заўзятым
Ягоны снег
дзесятую траву?

ГАРАЧЫЯ ЧАСЦІНКІ

Прыроду зямную ўсё болей болей
Укручвае людства ў сваю крутаверць.
І вось з рукатворнага пекла на волю
З сяўнёю вялізнаю выпаўзла смерць.

Упала на вагі апошняя кропля,
Услед за якой час расплаты прышоў.
На травах,
на квецені — чорныя кропкі,
Свіцца,
як рэшата, лісце гаёў.
І наш род праверыць даўно ёй карцела,
А смерць вучыць самай жахлівай цаной —
Часцінкі гарачыя спальваюць цела,
Бо душы працяты манкурцтвам, маной.

Яе ўжо назад не загоніш,
не вернеш,
Удосыць засыпаны
горад,
сяло...
Гарачых часцінак атрутнае зерне
Крыжамі на нашай зямлі прарасло.

І зараз — хто плача,
хто чэраву годзіць...
Мяне ж апаноўваюць думкі свае:
Гарачых часцінак у нас — на стагоддзі,
А сэрцаў гарачых дасюль не стае.

ПАЦАЛУНАК КРУМКАЧА

Беларусь адкрыла вочы,
Каб свой новы шлях пачаць,
Ды за ёю пільна сочыць
Хцівы позірк крумкача.
Ёй, дагэтуль невідушчай,
Лёгка зблытаць ноч і дзень.
На лугі, палі і пушчы
Наплывае чорны цень.
Як раней,
жаніх глюгаты
Да галубкі прыстае,
У сваю стадолу-хату
Цягне,
валачэ яе.
Ён на шлюб чакае згоды...
Хоць ты смейся,
хоць ты плач —
Не пускае на свабоду
Птушку
ўчэпісты крумкач.
Шэпча: «Ты адна такая...
Без цябе і мне не
жыць...»
Абдымае, прыціскае
Так,
што можа задушыць.
Я малюся дні і ночы
У Айчыны ля пляча,
Каб яе не выпіў вочы
Пацалунак крумкача.

КРЫНІЦА

А ўжо з тое крынічэнькі
арлы воду п'юць...
З народнай песні

Там, дзе нябёсаў гулкую званіцу
Гайдаюць неўтаймоўныя вятры,
Дзірван прабіла навылёт крыніца,
Жывой слязой сцякае ў плынь Віхры.

Яе люстэрка ахінае вечнасць
Сваім расшытым зорамі крысом.
Бярозы, як запаленыя свечкі,
Стаяць прад неўміручым абразом.

Пасля дарог,
трывог і неспакою
Паэт спяшаўся перш за ўсё сюды,
Каб павітацца з роднаю зямлёю,
Стаць на калені і папіць вады...

Паэт пайшоў,
ды засталося слова
І гэты з чыстаю вадою
кут,
Які заве крыніцай Куляшова
Увесь мсціслаўскі навакольны люд.

Не звёўся беларускі род дарэшты,
Сюды ідуць і зблізку,
і здаля.
За нас усіх,
знявераных і грэшных,
Крыніцай шчодрай
моліцца зямля.
З яе п'юць волю прагна арляняты,
Спрабуюць сілу гонкага крыла,
Каб на зямлю святую зноў накатам
Не падаў цень
чыгуннага арла...
Яна і ў вечнасці прароку сніцца,
Люляе зоры,
жаўранкам звініць...
Пакуль бруіць,
цячэ яго крыніца,
Ты,
Беларусь, не згінеш,
будзеш жыць.

ВЯСКОВАЕ ЖЫЦЦЁ Ў ГАРАДСКІМ ІНТЭР'ЕРЫ

РЭЦЭПТЫ СЯЛЯНСКАЙ ПАРТЫІ

Дзейнасць Беларускай сялянскай партыі, калі меркаваць па актыўнасці яе лідэраў (у першую чаргу старшыні Яўгена Лугіна) была за апошнія гады добрую вядомасць. Быў час, калі ніводная акцыя дэмакратычных сіл не абыходзілася без удзелу БСП. Ды толькі і рада БСП, і яе лідэры ў пэўны час зразумелі, што цесныя кантакты з БНФ, задавальненне ўсіх яго амбіцый не дазваляюць камандзе Лугіна працаваць з шырокімі масамі. Застаючыся ідэйна блізкай да Беларускага народнага фронту, Сялянская партыя паспрабавала дыстанцыравацца да яго. Тым больш, што ў апошні час гэтага вымагала сітуацыя

НАЎЗДАГОН

У МІНІСТЭРСТВЕ АДУКАЦЫІ ЛІЧАЦЬ ПАТРЭБНЫМ ЗАХАВАЦЬ ПРАВА ВЫБАРУ ЗА ВУЧНЕМ

У панядзелак у Міністэрстве адукацыі і навукі прайшла калегія, на якой быў перагледжаны спіс абавязковых выпускных экзаменаў за курс сярэдняй школы. Пасля завяршэння нарады наш карэспандэнт сустрэўся з намеснікам міністра адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь Генадзем ДЫЛЯНАМ.

— Да нядаўняга часу ў спісе выпускных экзаменаў значылася толькі абавязковая дыктоўка па рускай мове. Відавочна, гэтая акалічнасць супярэчыла прынцыпу роўнасці беларускай і рускай моў. Што вырашана па гэтаму пытанню?

— Нагадаю, што дагэтуль у нас былі абавязковымі вусныя выпускныя экзамены па беларускай літаратуры, замежнай мове і матэматыцы і пісьмовы — па рускай мове. Адсутнасць у гэтым спісе беларускай мовы сапраўды як бы прыніжала яе статус. Таму на калегіі мы вырашылі: па-ранейшаму за курс сярэдняй школы будуць здавацца абавязковыя вусныя экзамены па беларускай літаратуры, замежнай мове і матэматыцы, і ў дадатак вучню будзе прапанавана напісаць дыктоўку, але яе мову павінен абраць сам вучань. Лічу гэты варыянт аптымальным, бо ён задавальняе патрэбы як рускамоўнага, так і беларускамоўнага насельніцтва.

— Ці не ўзнікла прапановы, па аналогіі з мовамі, даць вучню права выбару: здаваць яму абавязкова беларускую альбо рускую літаратуру?

— Такая прапанова была, але сёння, за тры месяцы да выпускных экзаменаў, прымаць яе не зусім разумна. Магчыма, гэта будзе зроблена ў наступным навучальным годзе.

— Ці варта чакаць якіх-небудзь іншых змен у пераліку абавязковых экзаменаў за курс сярэдняй школы?

— У гэтым годзе ўсё па той жа прычыне — не. Але недзе ў маі-чэрвені ў міністэрстве зноў плануюць вярнуцца да гэтага пытання. У прыватнасці, ужо сёння чуюцца прапановы ўвесці ў якасці абавязковых экзамены па фізіцы і хіміі. Хаця, на маю думку, пашыраць колькасць абавязковых экзаменаў не варта: трэба пакінуць нейкі выбар за вучнем.

— Апошнім часам Міністэрства адукацыі і навукі з усіх бакоў папракаюць ледзь не ў антыбеларускай палітыцы. Што б вы маглі адказаць на гэта?

— Няхай лепшым адказам стане цяперашняя змена ў пераліку абавязковых экзаменаў. Ад свайго ж імя магу запэўніць: у міністэрстве ніякіх антыбеларускіх настрояў не было і не будзе. Але адбыўся рэферэндум, яго вынікі вядомыя, таму мы павінны ўлічваць адукацыйныя запатрабаванні як беларускамоўнага, так і рускамоўнага насельніцтва.

Сяргей ГРЫБ.

ПАСЛЯ ПРЫНЯЦЦЯ ПАДАТКАЎ БЮДЖЭТ БУДЗЕ НАКІРАВАНЫ НА ДАПРАЦОЎКУ ВА ЎРАД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт павінен мець магчымасць выкарыстоўваць гэтыя грошы на розныя нечаканыя выпадкі, магчыма, і на фінансавую дапамогу. Але гэтыя грошы павінны быць пад жорсткім кантролем Вярхоўнага Савета.

— А ці атрымалі вы справаздачу па выкананню бюджэту ў 1995 годзе?

— Папярэднія звесткі атрымалі, але афіцыйная справаздача будзе прыкладна ў красавіку. Час, адведзены на гэта, яшчэ не прайшоў.

— А як выконвалася даходная частка бюджэту ў студзені гэтага года?

— Каля 90 працэнтаў да ўзроўню снежня 1995 года...

— Выкананне бюджэту, як бачым, становіцца праблемай...

— Так, неплацяжы ў бюджэт былі праблемай і летась, і ўжо сёлета, і, відаць, яны будуць нарастаць. Якое тут выйсце? Відаць, у паслабленні падатковага прэса, мы ўсё роўна не можам сабраць гэтыя падаткі, яны вісяць, як хамут, на шыі ў прадпрыемстваў, і іх кіраўнікі ведаюць, што калі яны нешта заробяць — усё роўна гэта забяруць у бюджэт. Трэба вызваліць іх ці ад гэтых даўгоў, ці ад падаткаў на нейкі час. Хай яны запрацуюць. Трэба стварыць добрыя падатковыя ўмовы і для інвестараў.

Гутарыў Валер КАЛІНОЎСКІ.

ЮГАСЛАВЫ МАЮЦЬ НАМЕР СУР'ЁЗНА ГАНДЛЯВАЦЬ З БЕЛАРУСАМІ

Не выключана, што ўжо ў бліжэйшы час таваравабарот паміж Беларуссю і Югаславіяй будзе складаць 150 мільёнаў долараў у год. Аб гэтым было заяўлена 12 лютага на прэс-канферэнцыі ў Кабінеце Міністраў, якая падвяла вынікі візнаямленчай паездкі беларускай дэлегацыі ў Бялград.

Намеснік прэм'ер-міністра Леанід Сініцын, намеснік міністра знешніх эканамічных сувязей Мікалай Лешчанка і намеснік міністра замежных спраў Іван Антановіч падрабязна расказалі аб перагаворах з дзелавымі людзьмі і кіраўніцтвам Югаславіі. Паводле іх слоў, гэтай дружалюбнай балканскай краіне ўдалося выжыць ва ўмовах кровапралітнай вайны і неапраўдана жорсткіх санкцый толькі за кошт сельскай гаспадаркі. Пасля дасягнутых у Дайтане пагадненняў і адмены санкцый народ шматпакутнай крвіны ўздыхнуў з палёгкай. Ужо на бягучы год тут намечана пакончыць з дэфіцытам бюджэту і дабіцца росту вытворчасці на 7 працэнтаў.

Паводле слоў Леаніда Сініцына, беларускую дэлегацыю ў Бялградзе сустракалі з вялікай зацікаўленасцю. Ажыўленне вытворчасці тут звязваюць з актывізацыяй гандлёва-эканамічных сувязей па ўсіх напрамках. У Югаславіі гатовы купляць беларускія трактары, велікагрузныя аўтамабілі, станкі, калійныя ўгнаенні і прадукцыю вялікай хіміі. Гэта дазволіць рэзка павялічыць тавараабарот, які апошнім часам паміж дзвюма краінамі апускаецца амаль да нулявой адзнакі.

Віцэ-прэм'ер паведаміў, што пры сустрэчах з кіраўнікамі дзяржавы і ўрада Югаславіі дасягнута дагаворанасць аб падпісанні ў бліжэйшай будучыні паміж нашымі краінамі цэлага пакета пагадненняў. У ім будуць дагаворы аб дружбе і супрацоўніцтве, транспартных і авіяцыйных зносінах і шэраг іншых. Бялград мае намер адкрыць таксама сваё пасольства ў сталіцы Беларусі, а ўжо ў пачатку сакавіка ў Мінску сустрэнуцца кіраўнікі дзвюх дружалюбных дзяржаў.

Віктар САХАНКОЎ, БЕЛТА.

ЧЫМ БЛІЖЭЙ ВЫБАРЫ, ТЫМ ВЫШЭЙ РЭЙТЫНГ ПРЭЗІДЭНТА Б. ЕЛЬЦЫНА

У канцы студзеня рэспандэнтам было прапанавана адказаць на пытанне «Калі б выбары прэзідэнта Расіі адбыліся сёння, то за каго з пералічаных палітыкаў вы прагаласавалі б»? Можна было даць адзін адказ. Вось як размеркаваліся адказы (у працэнтах):

Г. Зюганаў	17,1
Р. Яўлінскі	11,3
Б. Ельцын	10,0
У. Жырыноўскі	8,9
А. Лебедзь	8,5
Іншы	8,8
Я не збіраюся ўдзельнічаць у выбарах прэзідэнта	11,9
Цяжка адказаць	23,4

У апытанні, праведзеным фондам «Грамадская думка» сярод гарадскога і сельскага насельніцтва Расіі, прыняў удзел 1361 рэспандэнт. Сацыёлагі звяртаюць увагу на тое, што прыметна вырас за апошні месяц рэйтынг прэзідэнта Барыса Ельцына — цяпер ён займае трэці радок у рэйтынг-лісце. Згодна з апытаннем, праведзеным УЦІАД з аналагічнай фармулёўкай пытання ў канцы снежня мінулага года, прэзідэнт быў толькі шостым — за яго гатовы былі прагаласаваць толькі 4 працэнты апытаных. У ліпені іх было толькі 3 працэнты.

Інтэрфакс.

АВАРЫЯ

НІШТО НЕ ВЕЧНА ПАД ЗЯМЛЁЙ

На ўчастку прадуктаправода паміж Унечай і Добрушам, у раёне Жгунскай Буды, адбылася аварыя. У навакольнае асяроддзе, паводле папярэдніх даных, трапіла каля 150 тон дызпаліва. На шчасце, спецыялісты спрацавалі аператыўна: аварыйны ўчастак удалося лакалізаваць і цяпер вядуцца аднаўленчыя работы.

Як высветлілася, прычына аварыі — знос і дэфармацыя металу. Да таго ж, рамонт прадуктаправода не рабіўся амаль трыццаць гадоў.

Віктар КОТАЎ, БЕЛТА.

ПРАДАЕЦЦА ДОМ У СТОЎБЦАХ
(драўляны, абкладзены цэглай, участак 16 сотак).
Тэл. у Баранавічах 2-71-59.

У МІНІСТЭРСТВЕ АБАРОНЫ ДОЛАРЫ НЕ ЛІЧАЦЬ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сума працэнтаў склала 30 тыс. долараў ЗША. У лік належных працэнтаў былі пастаўлены 2 аўтамабілі «ВАЗ-21053» на суму 12.960 долараў ЗША, г. зн. умовы дагавора не былі выкананы на 17.040 долараў ЗША. Вяртанне сумы пазыкі ажыццяўлялася не на валютны, а на рублёвы пазабюджэтны рахунак па дазволу начальніка ўпраўлення ваеннага бюджэту і эканомікі палкоўніка М. А. Чачухі. Усяго ў лік пагашэння пазыкі было пералічана 1219,0 млн. беларускіх рублёў, што адпавядае 106 тыс. долараў ЗША. Такім чынам, на момант заканчэння тэрміну дзеяння дагавора, г. зн. на 10 лістапада 1995 года, запазычанасць магазіна «Аўтамабілі» перад Міністэрствам абароны па пазыцы склала 111.400 долараў ЗША. Акрамя таго, за несвоечасовае вяртанне валютных сродкаў умовамі дагавора была прадугледжана аплата штрафу ў памеры 10 працэнтаў ад сумы пазыкі, г. зн. 20 тыс. долараў ЗША, а таксама налічэнне пені за кожны дзень пратэрміноўкі.

Трэба адзначыць, што кіраўніцтва Міністэрства абароны не зрабіла належных высноў з такіх жа парушэнняў, дапушчаных пры выкарыстанні валютных сродкаў, у тым ліку на прадастаўленне валютных пазык магазіну «Аўтамабілі». Аб гэтых парушэннях ужо адзначалася ў акце праверкі, праведзенай Кантрольнай палатай у маі-чэрвені 1994 года. Так, 10 лістапада 1993 года з дазволу былога міністра абароны П. П. Казлоўскага ад 8 лістапада 1993 г. фінансава-эканамічнае ўпраўленне Міністэрства абароны заключыла дагавор з магазінам «Аўтамабілі» на прадастаўленне апошняму валютнай пазыкі ў суме 143.350 долараў ЗША для закупкі партыі аўтамабіляў «Лада». Валюта прадастаўлялася на тэрмін не больш аднаго года. Па ўмовах дагавора за карыстанне пазыкай магазін «Аўтамабілі» павінен быў перадаць ва ўласнасць Міністэрству абароны тры новыя аўтамабілі «ВАЗ-2107» і адзін джып «Міцубісі Паджэра», або пералічыць 40 працэнтаў ад сумы пазыкі за карыстанне валютай. Як паказала праверка, валюта ў парушэнне ўмоў дагавора была пералічана не на рахунак магазіна, а непасрэдна пастаўшчыку — фірме «Балкерс-Траст». Пры гэтым за пералічэнне сродкаў з рахунку Міністэрства абароны банк спісаў камісійныя ў памеры 450 долараў ЗША. Умовы гэтага дагавора былі выкананы не поўнасцю. У лік яго выканання Міністэрства абароны атрымала толькі тры аўтамабілі «ВАЗ-2107». За джып «Міцубісі Паджэра» фінансава-эканамічнае ўпраўленне Міністэрства абароны 24 студзеня 1994 года дадаткова аплаціла 29.281 долар ЗША без узгаднення з міністрам, спасылаючыся пры іх пералічэнні на кантракт, які Міністэрства абароны... не заключала. Падставай для пералічэння валюты з'явіўся кантракт без нумара ад 24.01.1994 г., падпісаны начальнікам аўтаслужбы Міністэрства абароны палкоўнікам А. У. Жарабцовым без узгаднення з дагаворна-прававым упраўленнем і ў перавышэнне сваіх паўнамоцтваў. У кантракце не была ўказана назва набываемага тавару, не прыкладзены каштарыс цаны. Такім чынам, абавязацельствы магазіна «Аўтамабілі» перад Міністэрствам абароны па пастаўцы джыпа «Міцубісі Паджэра» не былі выкананы, хаця часткова магазін кампенсаваў яго кошт у суме 25,8 тыс. долараў ЗША, які фінансава-эканамічнае ўпраўленне Міністэрства абароны і залічыла як пагашэнне запазычанасці. На момант заканчэння тэрміну дзеяння дагавора пазыкі, г. зн. на 10 лістапада 1994 г., валютныя сродкі на рахунак Міністэрства абароны былі вернуты не поўнасцю (толькі 93 тыс. долараў ЗША). Аднак 10 лістапада 1994 г., у парушэнне п.1.3. Палажэння Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 11 красавіка 1994 г. № 302 аб парадку правядзення валютных аперацый, звязаных з рухам капіталу, у якім на правядзенне аперацый па перамяшчэнню валюты патрэбна наяўнасць ліцэнзіі Нацыянальнага банка, былы начальнік фінансава-эканамічнага ўпраўлення А. М. Задойка заключыў новы дагавор пазыкі, які працягваў дзеянне дагавора ад 10 лістапада 1993 г. яшчэ на адзін год, г. зн. да 10 лістапада 1995 года. Гэты дагавор прадугледжваў перадачу магазіну «Аўтамабілі» яшчэ 100 тыс. долараў ЗША і залічэнне астаткаў доўгу, якія склаліся па дагавору ад 10 лістапада 1993 года. Аднак валютныя сродкі магазіну «Аўтамабілі» па гэтаму дагавору не перадаваліся.

6 лютага 1995 года ў лік пагашэння запазычанасці па пазыцы магазін «Аўтамабілі» набыў для Міністэрства абароны ў фірмы «Дэнэл» аўтамабіль «Вольва» коштам 207 тыс. шведскіх крон, што адпавядае 27.710 доларам ЗША. Набыццё яго не прадугледжана ў каштарысе расходаў, кошт не быў пацверджаны дакументальна. Акрамя таго, магазін аплаціў банку камісійныя за пераход і тэлекс у суме 957 долараў ЗША, транспартныя расходы, не пацверджаныя дакументамі, у суме 675 долараў ЗША і мытную пошліну ў суме 7235 долараў ЗША. Нягледзячы на адсутнасць дакументаў на набыццё ўказанага аўтамабіля, галоўны бухгалтар падпалкоўнік В. І. Пінчук залічыў гэту суму як пагашэнне запазычанасці магазіна «Аўтамабілі».

У лік пагашэння пазыкі па дагавору ад 10 лістапада 1993 года магазін «Аўтамабілі» яшчэ двойчы пералічваў сумы валюты на рахунак Міністэрства абароны, у тым ліку 20.04.1995 г. — 27.500 долараў ЗША, 4.05.1995 г. — 13.199 долараў ЗША.

Нягледзячы на цяжкасці з фінансаваннем расходаў Міністэрства абароны з рэспубліканскага бюджэту, у тым ліку на рамонт і набыццё ваеннай тэхнікі, будаўніцтва жылля для ваеннаслужачых, вялікую дэбіторскую запазычанасць па камунальных паслугах, кіраўніцтва Міністэрства абароны адцягвала значныя валютныя сродкі для размяшчэння на дэпазітных рахунках, чым парушалася распараджэнне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 красавіка 1994 г. № 386. За правяраемы перыяд паміж Міністэрствам абароны і рознымі камерцыйнымі банкамі заключана 98 дагавораў дэпазіту, па якіх адцягнута з абароту 10.095,8 тыс. долараў ЗША і 200 тыс. нямецкіх марак, у тым ліку: з банкам «Алімп» — 27 дагавораў на агульную суму 3010,0 тыс. долараў ЗША, з банкам «Беларусь» — 28 дагавораў на суму 2785,8 тыс. долараў ЗША і 200 тыс. нямецкіх марак, з «Белагрампрамбанкам» — 23 дагаворы на суму 2300,0 тыс. долараў ЗША, з «Белпрамбудбанкам» — 20 дагавораў на суму 2000,0 тыс. долараў ЗША. Па дагаворах дэпазіту па выкарыстанню валютных сродкаў Міністэрства абароны атрымала ад камерцыйных банкаў 1041,0 тыс. долараў ЗША і 18,5 тыс. нямецкіх марак.

Указаныя дагаворы заключаліся і падпісваліся былым начальнікам фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства абароны палкоўнікам А. М. Задойкам і начальнікам упраўлення ваеннага бюджэту і эканомікі палкоўнікам М. А. Чачухам.

У асобных выпадках валютныя сродкі Міністэрству абароны вярталіся несвоечасова. Так, напрыклад, дагаворы №№ 27—36 першапачаткова былі заключаны на тэрмін 90 дзён пад 18 працэнтаў гадавых, аднак кіраўніцтва банка «Алімп» пасля заканчэння вызначанага тэрміну сродкі не вярнула. Начальнік упраўлення ваеннага бюджэту і эканомікі палкоўнік М. А. Чачуха заключыў з банкам «Алімп» дадатковае пагадненне яшчэ на 30 дзён і пад больш высокі працэнт — 21,5 працэнта гадавых. Аналагічнае становішча склалася і з дагаворам дэпазіту № 26, які таксама быў пралангаваны на 8 каляндарных дзён. На дзень праверкі банк разлічыўся з Міністэрствам абароны не поўнасцю. Па гэтых дагаворах Міністэрства недаатрымала 19,3 тыс. долараў ЗША.

З боку службовых асоб Міністэрства абароны адсутнічаў належны кантроль за выкананнем умоў заключаных дагавораў на набыццё матэрыяльных каштоўнасцей, прымяненнем штрафных санкцый за іх невыкананне.

Так, у маі 1994 года быў заключаны дагавор № ЕР-002/05/94 паміж упраўленнем заказаў і закупак тылу Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь і швейцарскай карпарацыяй Элі Лілі Экспарт АТ на закупку лекавых сродкаў на суму 9360 долараў ЗША. Па ўмовах дагавора гэты тавар павінен быць пастаўлены пакупніку ў адпаведнасці з графікам паставак, які пры праверцы не быў прадстаўлены. Падпісаў гэты дагавор былы начальнік упраўлення заказаў і закупак тылу Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь Я. І. Ткачук і ўзгоднены ён быў з былым начальнікам фінансавага ўпраўлення А. М. Задойкам. Узгадненне дагавора з медыцынскай службай не ажыццяўлялася. Сродкі ў суме 9360 долараў ЗША пераведзены на рахунак пастаўшчыка ў Сіці Банк (Лондан) у форме безадзыўнага пераводнага акрэдытыва 12 жніўня 1994 года. Тэрмін дзеяння гэтага акрэдытыва складаў 45 дзён. Умовы дагавора не былі выкананы, тавар медыцынская служба не атрымала. Валютныя сродкі вярнуліся на рахунак Міністэрства абароны толькі 24 лістапада 1994 года, пры гэтым банк утрымаў камісійныя за пераход валюты ў суме 150 долараў ЗША. Штрафныя санкцыі за непастаўку тавару вышэйназваны дагавор не прадугледжваў.

Былы начальнік упраўлення заказаў і закупак тылу Міністэрства абароны Я. І. Ткачук 14 красавіка 1994 года заключыў кантракт № 34 з нямецкай фірмай «Калор» на пастаўку рыбы мінтай, хаця каштарыс расходавання валютных сродкаў на 1994 год такія расходы не прадугледжваў. Кантракт быў узгоднены з начальнікам харчовай службы міністэрства В. Р. Фурсевым і былым начальнікам фінансава-эканамічнага ўпраўлення А. М. Задойкам. Тэрмін дзеяння кантракта быў вызначаны з 15 красавіка па 15 чэрвеня 1994 года. Праверкай устаноўлена, што рыба была пастаўлена на харчовыя склады Міністэрства абароны ў жніўні 1994 года, прычым дадаткова закуплены таксама селядзец і скумбрыя, хаця кантрактам гэтыя віды прадукцыі не былі прадугледжаны і цэны не агаворваны. Аплата за пастаўку прадукцыі выканана двойчы: 14 верасня — у суме 200 тыс. долараў ЗША, 5 кастрычніка — 223,9 тыс. долараў ЗША. Згодна з цаной, вызначанай у кантракце, за фактычна пастаўленую рыбу мінтай трэба было аплаціць 303,0 тыс. долараў ЗША. Астатняя частка валюты ў суме 120,9 тыс. долараў ЗША была пералічана фірме «Калор» па факту пастаўкі рыбы, не прадугледжанай дагаворам і па не пацверджанай дакументамі цане. Пры падпісанні акта праверкі галоўны бухгалтар упраўлення ваеннага бюджэту і эканомікі падпалкоўнік В. І. Пінчук прадставіў дапаўненне да кантракта, якое змяняла назву пастаўленай прадукцыі і, адпаведна, цэны на яе. Са следчых органаў была прадстаўлена копія другога кантракта пад тым жа нумарам, у якой быў зменены прадмет кантракта (дакумент знаходзіўся на выкананні на базе харчавання № 1068). У цяперашні час па матэрыялах гэтага кантракта Беларуская ваенная пракуратура праводзіць пракурорскую праверку.

Праверка захавання заканадаўства па расходаванню валютных сродкаў на службовыя камандзіроўкі ўстанавіла, што за перыяд з 1 ліпеня 1994 г. па 1 кастрычніка 1995 г. работнікі Міністэрства абароны ажыццявілі 113 выездаў за мяжу з удзелам 490 чалавек. На гэтыя мэты арасходавана 78,2 тыс. долараў ЗША і 13,1 тыс. нямецкіх марак, што перавысіла каштарысныя прызначэнні на гэту мэту на 1994-1995 гады.

У ходзе праверкі выяўлены паступленні на валютны рахунак Міністэрства абароны пазарэалізацыйных даходаў у замежнай валюце за арэнду лятальных апаратаў і за пралёт паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, з якіх не заплачаны падатак у даход дзяржаўнага бюджэту ў адпаведнасці з арт. 1 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падатках і зборах, якія бяруцца ў бюджэт Рэспублікі Беларусь». Упраўленне ваеннага бюджэту і эканомікі Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь а'яўляецца падаткаплацельшчыкам і павінна ўлічвацца ў Дзяржаўным рэестры падаткаплацельшчыкаў. На падставе арт. 8 указанага Закона плацельшчыкі падаткаў павінны рэгістравацца ў падатковай інспекцыі, аднак, маючы даходы ад гаспадарчай дзейнасці ў 1994—1995 гадах, упраўленне ваеннага бюджэту і эканомікі зарэгістравалася ў Дзяржаўнай падатковай інспекцыі па Партызанскаму раёну г. Мінска толькі з 16 лютага 1995 года. Да гэтага часу справаздачы ў падатковую інспекцыю галоўным бухгалтарам падпалкоўнікам В. І. Пінчуком не прадстаўляліся і падаткі не спаганяліся. Як устаноўлена, за адзначаны перыяд на валютны рахунак Міністэрства абароны паступілі пазарэалізацыйныя даходы ў суме 41,1 тыс. долараў ЗША, за што ў адпаведнасці з арт. 9 і 10 Закона «Аб падатках і зборах, якія бяруцца ў бюджэт Рэспублікі Беларусь» падлягаюць аплаце падаткі, адлічэнні і штрафныя санкцыі ў суме 528,3 млн. беларускіх рублёў.

Такім чынам, прадаставіўшы Міністэрству абароны права на выкарыстанне на ўласныя патрэбы валютных сродкаў, якія паступалі ад гаспадарчай дзейнасці ў 1993—1995 гадах, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь не даручыў адпаведным міністэрствам распрацаваць нарматыўныя дакументы аб парадку іх расходавання і кантролю. У выніку кіраўніцтва Міністэрства абароны выкарыстоўвала валютныя сродкі не на задавальненне першачарговых патрэб Міністэрства абароны (будаўніцтва жылля, набыццё і ўтрыманне ваеннай тэхнікі і маёмасці і г. д.), а на іншыя мэты (замежныя камандзіроўкі, выдачу пазык, доўгатэрміновае адцягванне валюты на дэпазітныя рахункі, набыццё дарагога аўтатранспарту і да т. п.). Пры гэтым парушалася дзеючае заканадаўства па вядзенню валютных аперацый, адсутнічаў асобны ўлік даходаў і расходаў ад гаспадарчай дзейнасці, не аплачваліся прадугледжаныя Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падатках і зборах, якія бяруцца ў бюджэт Рэспублікі Беларусь», падатковыя плацяжы.

Нягледзячы на існуючыя цяжкасці ў фінансаванні будаўніцтва жылля за кошт бюджэтных асігнаванняў (у чарзе на атрыманне жылля знаходзіцца 9536 чалавек), валютныя сродкі на гэтыя мэты ў 1995 годзе выдзяляліся надаставка.

Усяго па выніках праверкі падлягаюць унясенню ў бюджэт падаткі, плацяжы ў пазабюджэтныя фонды і штрафныя санкцыі ў суме 528,3 млн. рублёў.

Улічваючы вышэйвыкладзенае, Савет Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь вырашыў:

1. Адзначыць, што службовыя асобы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь (начальнік упраўлення ваеннага бюджэту і эканомікі М. А. Чачуха і галоўны бухгалтар В. І. Пінчук парушылі заканадаўства, якое рэгулюе парадак выкарыстання валютных сродкаў, правядзенне валютных аперацый і падаткавабкладанне.

2. Патрабаваць ад міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнанта Л. С. Мальцава прыняць меры па ліквідацыі адзначаных недахопаў у выкарыстанні валюты і прыцягнуць да адказнасці службовых асоб, вінаватых у парушэннях дзеючага заканадаўства.

3. Лічыць немэтазгодным знаходжанне на пасадзе начальніка ўпраўлення ваеннага бюджэту і эканомікі Міністэрства абароны палкоўніка М. А. Чачухі і намесніка начальніка Першага аддзела — галоўнага бухгалтара гэтага ўпраўлення падпалкоўніка В. І. Пінчука.

4. Даручыць Галоўнай падатковай інспекцыі пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (Дзямчук М. М.) забяспечыць унясенне Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь у рэспубліканскі бюджэт 528,3 млн. рублёў падатковых плацяжоў.

5. Матэрыялы праверкі накіраваць у следчыя органы.

Вось такі дакумент. У ім усё праверана і, як падкрэслілі ў Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь, не адзін раз пераправерана. Цікава, а ці мае што сказаць у адказ кіраўніцтва Міністэрства абароны? «Звязда» гатова прадаставіць для гэтага свае старонкі.

У СВЕЦЕ

ПЕЛЕНГ-НАВІНЫ

- **СПАКОЙ ПАСЛЯ БУРЫ**

У Грозным вядзецца аперацыя па разміраванню і ачыстцы плошчы перад будынкам былога палаца Дудаева, дзе на працягу мінулага тыдня праходзіў несанкцыяніраваны мітынг апазіцыйных сіл. Падыходы да плошчы блакіраваны — зносяцца ўзведзеныя там часовыя пабудовы. Паводле паведамленняў сапёраў, на плошчы знойдзены скрынкі з мінамётнымі мінамі. На тэрыторыі, якая прылягае да плошчы, вядзецца расчыстка завалаў і знос паўразбураных будынкаў, на месцы якіх плануецца ўзвесці новыя дамы. Становішча ў горадзе застаецца спакойным, у звычайным рэжыме працуюць дзяржаўныя ўстановы, магазіны, рынак.

- **ЗЮГАНАЎ МАЕ РЭАЛЬНЫ ШАНЦ СТАЦЬ ПРЭЗІДЭНТАМ РАСІІ**

Лідэр камуністаў Генадзь Зюганаў мае шанц перамагчы ўжо ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў, калі ўдасца дасягнуць аб'яднання ўсіх левадэмакратычных сіл. Як паведаміў спікер Дзярждумы Генадзь Селязнёў, зараз вядуцца адпаведныя перамовы. 15 лютага будзе аб'яўлена, з якімі левадэмакратычнымі партыямі і рухамі будзе заключаны саюз.

- **ЗІМА. ПАДАЮЦЬ «МИГІ»**

12 чалавек атрымалі раненні ў выніку катастрофы баявога самалёта тыпу «МИГ», якое адбылося ў панядзелак у адным з індыйскіх штатаў. Адразу пасля ўзлёту з аэрадрома лётчык паведаміў, што ўзніклі тэхнічныя непаладкі. Машына дрэнна слухалася руля вышыні і хутка падала. Пілот быў вымушаны катапультавацца, а «МИГ» упаў побач з адным з пасёлкаў. Трэба адзначыць, што гэта ўжо другі за апошнія двое сутак падобны выпадак з самалётамі тыпу «МИГ».

- **ААН — БАНКРУТ?**

ААН ужо да канца гэтага года будзе банкрутам. Аб гэтым заявіў на пасяджэнні рабочай групы па фінансах Генеральнай Асамблеі ААН намеснік генеральнага сакратара ААН па адміністрацыйных пытаннях Джозеф Конар. Ён сказаў, што да 31 снежня ў ААН не застанецца наяўных грошай, а яе доўг складзе 420 мільёнаў долараў. Па яго словах, толькі 25 краін заплацілі свае ўзносы за 1996 год.

- **УРАД ЯПОНІІ ПАПРОСІЦЬ ПРАБАЧЭННЯ Ў ПРАСТЫТУТАК**

Савет па грамадзянскіх правах ААН выпрацаваў праект даклада, які заклікае ўрад Японіі выплаціць кампенсацыю азіяцкім жанчынам, якія прымушаліся да прастытуцыі і абслугоўвання японскіх вайскоўцаў падчас другой сусветнай вайны. У дакладзе гаворыцца, што бардэлі ў перыяд вайны з'явіліся парушэннем міжнароднага права, якое забараняе палавое рабства і што японскі ўрад у пісьмовай форме павінен папрасіць прабачэння ў ахвяр.

- **СЁМЫ РАЗВОД АМЕРЫКАНСКАЙ ЗОРКІ**

У Лос-Анжэлесе 59-гадовая актрыса Элізабет Тэйлар падала заяву ў суд, патрабуючы разводу са сваім сёмым мужам. У якасці падставы разводу ў заяве ўказваюцца непрымірымыя рознагалоссі.

- **З ТАКІЙСКАЙ ТУРМЫ ЗБЕГЛІ 7 ІРАНЦАЎ**

Ужо некалькі дзён у Японіі працягваюцца пошукі сямі іранцаў, якія ў ноч на панядзелак учынілі дзёрзкія ўцёкі з такійскай турмы папярэдняга знаходжання. Гэта ўстанова не бачыла нічога падобнага з 1955 года, калі з турмы апошні раз былі наладжаны ўцёкі. На пошукі ўцекачоў, якія падчас уцёкаў пераадолелі 5-метровыя агароджы і некаторыя іншыя даволі сур'ёзныя перашкоды, кінуты шматлікія сілы паліцыі. Іх пошукам займаюцца 120 работнікаў следчых органаў і супрацоўнікаў турмы.

Радыё «Свабода», «Голас Амерыкі», «Радыё Расіі» і «Радыё-РОКС» слухаў Сяргей ПРОТАС.

ІНФАРМ-КАКТЭЙЛЬ

Шведскі фермер-свінавод Біргер Муквіст раніцай, зазірнуўшы ў хлеў, быў непрыемна здзіўлены незвычайным стогнам сваіх падапечных. Усе дзве з паловай тысячы жывёл паводзілі сябе яўна неадэкватна. Адны з іх поўзалі, валяліся, многіх ванітавала. Выкліканы ветэрынар канстатаваў... вострае алкагольнае атручэнне. Выявілася, што на мясцовай малочнай ферме, якая пастаўляла адходы вытворчасці для харчавання свіней, замест звычайнага прадукту для харчавання жывёлы адправілі ферментавае перабрадзіўшае малако, якое ператварылася ў брагу. Частку свіней прыйшлося адправіць на бойню. Астатнія ачуналі пасля «папойкі» толькі на трэці дзень.

Асашыэйтэд Прэс.

Незвычайны ўлоў трапіў у сеткі судна «Макараў» у Баранцавым моры. Рыбакі закінулі трал усяго ў 150 кіламетрах ад Паўночнага полюса. Калі ж пачалі яго выцягваць, здавалася, што ўлоў будзе рэкордным. Аднак, на вялікае здзіўленне матросаў, замест чакаемай рыбы ў сетцы было нешта іншае — белы «Форд-Фіеста». На думку нарвежскага страхавога агенцтва «Астад», месца выяўлення аўтамабіля цалкам вытлумачальнае: несумненна, машына з'яўляецца доказам падману страхавой кампаніі.

ЭКСТРА-ПРЭС.

Вядома, што манахі вядуць маларухомы лад жыцця. Гэта выклікае нездаровае атлусценне. Каб пазбегнуць гэтага, тыбецкія мудрацы распрацавалі формулу, якая складаецца з пэўных складоў. Яны рэкамендавалі паўтарацца яе два разы на дзень па 15 хвілін. Гаварыць яе трэба напаўголасу, з заплюшчанымі вачыма. Лепш, каб пры гэтым чалавек у памяшканні быў адзін. Вось гэтая «чароўная формула»: Сан-Сіа-Уіі-Най-Пай-Тун-Доу. Менавіта дзякуючы ёй усе будысцкія манахі маюць нармальную вагу. А зусім не таму, што прытрымліваюцца строгага посту і шмат гадзін моляцца.

«Чайна Геральд».

БЕЛАРУСЬ — ГЕРМАНІЯ

ПАГАДНЕННЕ, ЯКОГА ЯШЧЭ НЯМА, УЖО ПРАЦУЕ

Днямі ў пасольстве Германіі адбылася цырымонія перадачы абсталявання коштам 70 тысяч нямецкіх марак

Яно будзе выкарыстана беларускім бокам, а дакладней — пэўным органам для фарміравання банка даных па хімічнай вытворчасці ў Беларусі, таксама стварэння сістэмы камп'ютэрнай сувязі паміж ведамствамі і прадпрыемствамі, якія займаюцца выкананнем міжнароднай канвенцыі па забароне ядзернай зброі. Яна была падпісана Беларуссю 13 студзеня 1993 г. і ратыфікавана 9 лютага 1995 г.

Параўнаўча нядаўна беларускія дыпламаты правялі кансультацыі з МЗС Германіі і Нідэрландаў на прадмет аказання нашай краіне дапамогі ў арганізацыі работы і тэхнічным абсталяванні па выкананню канвенцыі. І вось першы вынік. Пасол ФРГ Готфрыд Альбрэхт перадаў гэта абсталяванне ў якасці дару пад будучае міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў вырашэнні праблем нераспаўсюджвання ядзернай і хімічнай зброі. Над ім зараз працуюць эксперты.

Андрэй Саннікаў, намеснік міністра замежных спраў Беларусі, які прымаў абсталяванне, выказаў надзею на далейшае і плённае развіццё адносінаў паміж дзвюма краінамі.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

РЭПАРЦЁР АТРЫМАЎ ЗАДАННЕ...

ПАВІНШАВАЦЬ СЯБРА З ДНЁМ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА

14 лютага закаханыя, ды і не толькі яны, адзначаюць дзень святога Валянціна.

Да нас яно прыйшло з Еўропы, чым пацвердзіла, што для кахання і дружбы граніц не існуе. Дзень усіх закаханых звязваюць з хрысціянскім епіскапам Валянцінам. Існуе легенда, што перад тым, як яго пакаралі рымляне, ён паслаў слялой дачцэ свайго турэмшчыка пісьмо з прызнаннем у светлых пачуццях. Хто ведае, магчыма, сан яго не дазваляў назваць гэта пачуццё інакш. З

Сядзіба

Выпуск № 325 Рубрыку вядзе Мікалай ЧАХОЎСКІ

ЖЫВЁЛА І ПТУШКА НА ДАЧНЫХ УЧАСТКАХ

ПОГЛЯД АРХІТЭКТАРА

З дачнымі ўчасткамі звычайна звязваюць індывідуальнае садаводства і агародніцтва. Аднак цяпер прасочваецца тэндэнцыя да пашырэння межаў іх выкарыстання. Усё часцей назіраюцца выпадкі ўтрымання на дачах курэй, індыкоў, гусей, качак, трусоў, коз і нават свіней. Занятак індывідуальнай жывёлагадоўляй гараджанамі, якія часта не маюць традыцыйнага вопыту ў гэтай справе, суправаджаецца ўзвядзеннем немудрагелістых элементарных гаспадарчых пабудоў. Часта з падручнага матэрыялу, з парушэннем адпаведных санітарных нормаў і правілаў. Гэта прыводзіць да нерацыянальнай траты намаганняў і часу, пагаршэння мікраклімату і эстэтычнага выгляду дачнага пасёлка.

Да таго ж, будаўніцтва з парушэннямі нормаў рана ці позна прыводзіць да маральных і матэрыяльных выдаткаў, паколькі на сваім участку нельга будаваць як уздумаецца. Пабудовы павінны адпавядаць пэўным патрабаванням.

Трэба адзначыць, што дачны ўчастак і пабудовы на ім адпавядаюць паняццю «нерухомасць». Згодна з заканадаўствам, яны могуць перадавацца ва ўласнасць. Становячыся ўласнікам нерухомасці (зямлі, пабудоў, пасадак), важна, каб гэта не з'яўлялася прычынай непрадбачаных затрат. Напрыклад, пры страхаванні нерухомасці гарантаваная кампенсацыя можа быць вельмі невысокай, калі парушаны, скажам, пажарныя нормы. Па гэтай жа прычыне могуць адмовіць у крэдыце пад заклад нерухомасці. Усякае парушэнне палажэння аб размяшчэнні пабудоў у адносінах да суседзяў можа стаць прычынай канфліктаў і нават судовых разбораў.

Пры вытворчасці прадуктаў птушкі- і жывёлагадоўлі больш выразна, чым толькі пры садаводстве і агародніцтве, выяўляецца вытворчая функцыя дачнага ўчастка і пабудоў, у якіх адбываецца гэты працэс. Пры гэтым яны аб'ядноўваюцца ў своеасаблівы комплекс, у якім праходзіць гаспадарчая дзейнасць.

Таму, пачынаючы разгляд тэхналагічных, будаўнічых і архітэктурных пытанняў утрымання дробнай жывёлы і птушкі, неабходна спыніцца на агульных прынцыпах яго фарміравання: па-першае, трэба забяспечыць спрыяльныя санітарна-гігіенічныя ўмовы і пажарную бяспеку, па-другое, арганізацыя ўсёй работы па атрыманню для патрэб сям'і садова-агароднай прадукцыі і прадукцыі жывёлагадоўлі павінна быць рацыянальнай; па-трэцяе, забудова павінна быць эканамічнай, тэрыторыя ўчастка выкарыстоўвацца мэтазгодна і, па-чацвёртае, неабходна імкнуцца да архітэктурнага адзінства жылога дома, пабудоў, зялёных насаджэнняў, добраўпарадкавання.

Жылы дом размяшчаецца не бліжэй як за 3 метры ад мяжы суседняга садовага ўчастка, і, як правіла, не бліжэй як 10—15 метраў ад суседніх дамоў. Адлегласць паміж жылым домам і памяшканнем для ўтрымання хатняй птушкі і трусоў, а таксама кампоставай пляцоўкі, ямы або скрыні павінна быць не менш як 7 метраў. Калі прадугледжваецца ўтрымліваць больш буйных жывёл (коз, авечак, свіней і інш.), то памяшканне трэба размяшчаць на адлегласці не менш чым 15 метраў ад вокнаў і не бліжэй як 4 м ад мяжы суседняга ўчастка. Хлеў для ўтрымання жывёлы і птушкі можа размяшчацца і на мяжы ўчастка, калі з боку суседа блакіруецца такая ж пабудова. Самі пабудовы павінна падзяляць каменная сцяна таўшчынёй не менш як 25 см.



На малюнку — варыянты комплекснай забудовы дачнага ўчастка.

Надворная ўборная ставіцца на адлегласці не менш як 12 метраў ад жылога дома і адзін метр — ад мяжы ўчастка. Уборную можна блакіраваць з хлевам для ўтрымання жывёлы і птушкі. У сваю чаргу хлеў можна блакіраваць з гаражом, збудаваннямі для захоўвання кармоў, інвентару, паліва, прыгатавання кармоў. Дазваляецца прыбудова хлева для жывёлы і птушкі да жылога дома, але такую блакіроўку па санітарна-гігіенічных меркаваннях мы не рэкамендуем.

Пабудовы для хатняй жыўнасці мэтазгодна размяшчаць у той частцы ўчастка, дзе па генеральнаму плану вызначана будаўніцтва ўборнай. Прадугледзець месца пад невялікі выгульны дворык, устройства жыжкавазбіральніка, а таксама арганізацыі зручнага падыходу да іх. На падобныя мэты неабходна 50—70 квадратных метраў тэрыторыі ўчастка.

З мэтай эканамічнасці будаўніцтва рэкамендуецца не толькі групаваць падсобныя памяшканні і памяшканні для ўтрымання жывёл у адно цэлае, але і па дагаворанасці з суседзямі блакіраваць пабудовы суседніх участкаў. Нароўні з эканамічнасцю гэта дазволіць ставіць агульны падыход да іх граніцы.

Для ўтрымання жывёлы і птушкі дастаткова пабудовы плошчай 10—15 квадратных метраў. Уваход у хлеў лепш за ўсё прадугледжваць з паўднёвага боку, на паўднёвы ўсход арыентаваць аконныя праёмы. Гаспадарчую зону можна абмежаваць пасадкай кустоў (напрыклад, маліны, чарнаплоднай рабіны). Гэта для таго, каб была візуальная ізаляцыя «бруднага месца», каб не задзімаў вецер. Дарожкі і пляцоўку для выгулу жывёлы і птушкі рэкамендуецца рабіць з бетону, асфальту, пліт і каменю.

Вядома, поспех у многім будзе залежаць ад акуратнасці пры ўтрыманні жывёлы, рэгулярным выдаленні гною і памёту, назапашванні яго і ўкрыцці торфам або зямлёй на кампоставых пляцоўках. Пры гэтым можна выключыць уоякія пахі, якія могуць стаць прычынай нездаволенасці суседзяў. Зноў умела выкарыстаць садовыя кусты і дрэвы. Можна сад разбіваць непасрадна ля дома, аддзяляючы дрэвамі жыллё ад гаспадарчай зоны. Увогуле, прастора дачнага ўчастка набывае неабходныя эстэтычныя якасці толькі тады, калі ўсе яго элементы будуць увязаны ў адзінае цэлае пры несумненным кампазіцыйным дамінаванні жылога дома.

Анатоль СТАРАСЦЕНКА,
Ларыса ІВАНЧАНКА,
архітэктары.

ЗІМОВАЯ ПРЫШЧЭПКА

Першая дзесяцідзённка лютага выдалася вельмі халоднай. Марозы здаралася, апускалі ўначы ртутны слупок тэрмометра да 30-градусных адзнак. Гэта былі ці не самыя халодныя перыяды. Нешта падобнае здаралася яшчэ ў снежні мінулага года.

Як бы ні злаваўся Дзед Мароз, але прыродныя з'явы яму не павярнуць у іншы бок. Ужо ў канцы лютага магчымы адлігі, а ў сакавіку — абавязкова. Вядома, у гэты час больш свабоднага часу. І садавод можа выкарыстаць зацішную пару, каб зрабіць прышчэпкі. Работа вельмі простая. Часу займае не вельмі шмат. Карысць ад яе — відавочная: прышчэпа і прышчэпак знаходзяць паміж сабою ўзаемаразуменне, кранаюцца ў рост вельмі дружна, увачавідкі набіраюць моц і ўрэшце праз год-другі даюць плады. Для работы патрэбны: здаровыя чаранкі-аднагодкі (іх можна зрэзаць непасрэдна з дрэва); пілка з добрым роўным і вельмі дробным зубам на палатне; сякатар; нож для прышчэпак (наточаны да вастрыні ляза для галення); стужка, якой ізалюецца электраправады; мяшочкі з поліэтылену; садовы вар.

Паслядоўнасць работы такая. У вызначаным месцы на дрэве ці дзічцы пілкай адразаем ствол ці галінку. Нажом, які папярэдне абяшкоджаны ў марганцоўцы густога вішнёвага колеру, праходзім па зрэзу, ліквідуючы няроўнасці, задзірыны, дробныя шчарбінкі. Тут жа колем пянёк папалам. Адразу мусім адзначыць, што ўдаецца прышчэпка «ў расшчэп», як кажуць, без праблем. Усе астатнія: у бакавы зарез, у прыклад, палепшаная акуліроўка, пупышкай за кару і г. д. пакінем на больш позні перыяд, калі для гэтага створацца неабходныя ўмовы.

З чаранка вырэзаем сярэдзіну. Верхавінку і ніз адкінем. На зрэзах усё «жывое», сакавітае, зялёнага колеру. Гэта на прадмет падмярзання. Пупышак на чаранку можа быць дзве і больш — да пяці. Можна паспрабаваць прышчапіць цэлую галінку, але яе дадаткова замацаваць. Інакш вецер абавязкова адломіць. У ніжняй частцы чаранка (камлі) робім зарэзы (глядзі на малюнках) і ўрэшце атрымліваецца клінок, які добра відаць. Застаецца ўставіць яго ў расшчэп.

Звычайна дапамагаем нажом, расхінаючы расшчэп. Чаранок устаўляем такім чынам, каб адзін бок абавязкова супадаў з карою прышчэпы, быў на адным узроўні. Калі прышчэпка і прышчэпак не адпавядаюць па таўшчыні (чаранок у некалькі разоў танейшы), у другім баку зрэзу ўстаўляем яшчэ адзін чаранок. Абавязкова да канца.

Цяпер застаецца добра сціснуць і заматаць ізаляцыйнай стужкай. Пачынаць знізу і ісці ўверх, ліпкім слоем стужкі ад прышчэпы. Застаецца замазаць усе адтуліны і ранкі разагрэтым садовым варам. Зверху прывязаць цэлафанавы мяшочак. Не сядуць птушкі, пад укрыццём свой мікраклімат.

Часта ў навічкоў прышчэпкі не ўдаюцца. Чаму? Найбольш па прычыне бруду, які заносіць сам садавод. Памятаць, што лязо нажа час ад часу акунаецца ў марганцоўку, за зрэзы на чаранку не бракуе рукамі, добра замазваць раны. Сам чаранок са здаровымі пупышкамі, якія быццам наліты энергіяй.

«ДЛЯ ВАС» У МАГАЗІНАХ І ПА ПАДПІСЦЫ

У канцы студзеня — пачатку лютага былі званкі з Мастоў, Расонаў і нават Мінска. Людзі скардзіліся, што не атрымалі наша выданне — брашуру «Сеем!» Здаецца, цяпер усё ўладжана. Ці можа не так, паважаныя падпісчыкі? Напішыце.

Раскупляецца наша новая кніжка вельмі добра. У Мінску, напрыклад, яе ўжо нялёгка знайсці ў кіёсках «Саюздруку». Дзе прадаецца яшчэ? У магазінах, дзе набываюць насенне. І вядома ж, у магазінах «Глобус» (галоўпаштамт), «Сельгаскніга» (праспект Скарыны), «Белсельгасхімія» (Чырванаармейская, 8).

Неўзабаве брашура паступіць у кіёскі «Саюздруку» Мінскай вобласці. Не жаль, колькасць вельмі абмежаваная.

Таму раім дачнікам і сялянам аформіць падпіску на красавік, май, чэрвень (у кожным месяцы — па адной брашуры). Для гэтага завітаць у любое паштовае аддзяленне. Лепш па месцы жыхарства. Кошт на месяц — 3 тысячы рублёў, на тры — 9.000.

Вось якія тэмы будуць раскрыты ў наступных выданнях першага паўгоддзя:

«Для вас» № 19 — красавік. Усё пра прышчэпкі. Як самому зрабіць гэту справу. Абрэзка дрэў, падкормка саду, які пладаносіць, і маладога. Як дабіцца высокага ўраджаю парэчак, агрэсту і маліны, зялёнае чаранкаванне і іншае.

«Для вас» № 20 — май. Абарона ўсіх раслін саду і агароду ад шкоднікаў і хваробаў. Народныя і агульнадаступныя хімічныя метады. Прафілактыка. Практыка лепшых майстроў гэтай справы.

«Для вас» № 21 — чэрвень. Выдумкі-здабыткі кемлівых майстроў. Расказы - парады: як самім зрабіць, скажам, апырсквальнік; зручны «камбайн» для сушкі ягад і пладоў ці здабывання соку; як салатаць плёнку; зрабіць дзверы ў цягліцы; абсталяваць уласную кацельню з... гною; самыя нечаканыя парады па паскораным вырошчванню культур і многае іншае.

Падпісны індэкс газеты-брашуры для дачнікаў і сялян «Для вас» ранейшы — 63236. Адначасова паведамляем, што лютаўскі нумар, які прысвечаны паслёнавым культурам (бульбе, памідорам, перцам, баклажанам, фізалісу і тытуню), выйдзе паміж 23 і 26 лютага бягучага года.

РЭШТА

Старажытныя грэкі назвалі Герадота «бацькам гісторыі» — за энцыклапедычнасць яго ведаў, за дакладнасць, верагоднасць і аб'ектыўнасць звестак, якія прыводзіў у сваіх працах гэты таленавіты гісторык. Даследчыка Міколу Улашчыка, на мой погляд, можна назваць беларускім Герадотам менавіта за тыя ж якасці, што былі характэрны і для даследаванняў старажытнагрэчаскага гісторыка.

Беларускі Герадот

14 лютага 1996 года — 90-годдзе М.М. Улашчыка

Сёння на геаграфічнай карце Беларусі не знойдзеш вёскі Віцкаўшчына Дзяржынскага раёна, дзе 14 лютага 1906 года нарадзіўся гэты чалавек.

У працах вучонага праглядваюцца тры асноўныя напрамкі: 1) сацыяльна-эканамічная гісторыя Беларусі і Літвы ў канцы XVIII — першай палове XIX стагоддзя (уключаючы сялянскі рух у рэгіёне і сацыяльна-крыніцазнаўчыя даследаванні); 2) вывучэнне і выданне рускіх і беларуска-літоўскіх летапісаў; 3) гістарыяграфія айчыннага крыніцазнаўства. Але вызначэнне кола інтарэсаў Мікалая Мікалаевіча будзе насіць даволі фармальны характар, калі мы не будзем улічваць таго, што ўсё гэта — звёны аднаго ланцуга.

Мікола Улашчык быў арыгінальным гісторыкам, гістарыёграфам, крыніцазнаўцам, этнографам, краязнаўцам, літаратуразнаўцам.

Асобае месца ў яго творчай спадчыне займае манаграфія «Перадумовы сялянскай рэформы 1861 г. у Літве і Заходняй Беларусі» (1965).

Навуковай грамадскасцю не толькі Беларусі, але і ўсяго Савецкага Саюза, а таксама вучонымі іншых краін былі высока ацэнены манаграфіі Міколы Улашчыка «Нарысы па археаграфіі і крыніцазнаўству Беларусі феадальнага перыяду» (1973) і «Уводзіны ў вывучэнне беларуска-літоўскага летапісання» (1985).

Ужо пасля смерці вучонага выйшла ў свет яго кніга «Была такая вёска» (1989).

На падставе глыбокага вывучэння дакументаў Цэнтральных дзяржаўных архіваў Беларускай і Літоўскай ССР, аўтар пранікае ў таямніцы гісторыі роднай вёскі, яе ўзнікнення і развіцця.

Калі не браць пад увагу паноў, адзначае Улашчык, у тым ліку і дробных, а ўзяць толькі тых, хто працаваў на зямлі, дык гэта насельніцтва ў наваколлі Віцкаўшчыны можна падзяліць на тры асноўныя групы, у кожнай з якіх існаваў і больш дробны падзел.

Наверсе гэтай лесвіцы стаяла дробная шляхта, што жыла на хутарах і ў засценках — невялікіх паселішчах па 5—10 двароў. Следам за шляхтай ішлі праваслаўныя хутаране, якія мелі па 30—60, а падчас і па 80—100 дзесяцін зямлі (амаль заўсёды купленай). На апошняй прыступцы гэтай лесвіцы знаходзіліся былыя прыгонныя. Сярод іх таксама не было роўнасці, бо адны гаспадары мелі па 20 дзесяцін, а другія — па 3—5, а некаторыя (іх, праўда, было вельмі мала) не мелі нічога.

У чым каштоўнасць нарыса «Была такая вёска»? Шмат у чым. Той, хто цікавіцца гісторыяй беларускай вёскі, даведаецца шмат цікавага аб планіроўцы вёскі і сядзіб, аб хатах, гумнах, свірнах нашых дзядоў і прадзедаў.

Адзін з раздзелаў кнігі носіць такую назву: «Чым аралі, жалі, пралі». Гэта ўжо не толькі гісторыя, але і этнаграфія беларусаў. Хто з сучасных юнакоў і дзяўчат бачыў таўкач ці сякач? Што гэта за прылады працы? Прачытаўшы дадзены раздзел нарыса Улашчыка, мы знойдзем адказ на гэта пытанне.

Увагу чытача, безумоўна, прывабіць замалёўка вучонага аб сям'і і шлюбе. Улашчык заўважае, што хлопцы жаніліся найчасцей пасля «прызыву», адбыўшы вайсковую службу, якая канчалася ў 25 гадоў. Дзяўчаты выходзілі замуж звычайна ва ўзросце каля 20 гадоў. Сяляне надзвычай непрыязна ставіліся да пазашлюбных дзяцей, жыццё якіх было гэткае ж гаротнае, як і доля іхніх мацярок.

Бадай, ні ў адной з кніг па этнаграфіі беларусаў не знойдзеш такога падрабязнага апісання мужчынскай і жаночай працы, як у творы Улашчыка «Была такая вёска». Прычым напісана не проста навукова, а навукова-папулярна, з народным гумарам. Да таго ж Мікалай Мікалаевіч адзначае тое, што бачыў і назіраў сам. Таму яму можна верыць ва ўсім.

А колькі пазнавальнага і цікавага для сябе знойдзем мы ў замалёўках Улашчыка аб транспарце і побыце віцкаўцаў, аб іх «хлебе і да хлеба»!

Міколе Улашчыку давялося перажыць шмат несправядлівасцей. У канцы 1930 года малады таленавіты гісторык быў прымусова высланы з Беларусі як так званы «нацдэм», паднявольна жыў у гарадках Прыўралля, у паўночна-ўсходнім кутку еўрапейскай часткі Расіі. Ён настаўнічаў у Нолінску Кіраўскай вобласці, Ульянаўску, Чарапаўцы, Дзергачах Саратаўскай вобласці. Мікалай Мікалаевіч выкладаў спачатку матэматыку, затым геаграфію, а потым і гісторыю. Давялося выкладаць гісторыю ў тэхнікумах сувязі і медыцынскім г. Іванава.

У 1991 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў у свет літаратурна-навуковы гадавік «Скарыніч». У гэтым зборніку пад рубрыкай «Гісторыя грукае ў сэрца» апублікавана частка аўтабіяграфічных нататкаў М. М. Улашчыка пад назвай «Хроніка». Прывядзём вытрымкі з гэтых успамінаў:

«Прывезлі мяне першы раз у Сібірскія лагеры ў верасні 1933 г. Сталіца Сіблагу знаходзілася... у Марыінску (зараз Кемераўскай вобласці). У верасні 1933 г. мне да канца тэрміну заставалася 20 месяцаў...

З Менску я выпісаўся ў лютым 1930 г., у Ленінградзе жыў у тым годзе неяк выпадкова, арыштаваны быў у казарме як невайскавік, пасля ссылка...

Ужо летам 1934 г. я думаў — куды б мне паехаць пасля вызвалення. Менск і наогул Беларусь цалкам адпадала. Практыка паказвала, што калі чалавек пасля лагеру вернецца на Беларусь, то праз кароткі час яго забяруць ізноў...

*Пры вывучэнні курса геаграфіі СССР (у 1936 г. ва Ульянаўску. — **Э. І.**) шмат азначала маё непасрэднае знаёмства з краінаю. Я такі паездзіў: быў на Украіне, праплыў па ўсім Дняпры і быў на Чорным моры. Быў у Маскве, Ленінградзе і ў Сярэдняй Азіі...*

Наогул, на занятках мяне ратавала агульная начытанасць і памяць. Перачытаўшы па падручніку і прыпомніўшы ўсё, што ведаў з літаратуры, я, выкладаючы новы матэрыял, ніколі не заглядаў ні ў якія канспекты ці запісы. Вельмі высока студэнтамі цанілася справядлівасць: ніколі не ставіў нізкіх ацэнак тым, хто ведаў матэрыял і не стараўся падладжвацца пад «начальнікаў» (сакратароў партыйнай арганізацыі і камсамольскай, старшыню прафкома)...»

З тых часоў у асабістай справе Міколы Улашчыка з'явілася «пляма». Ён быў адзіным беспартыйным у Інстытуце гісторыі СССР АН СССР. Не дзіўна, што самая высокая ўзнагарода, якую ў сваім жыцці атрымаў вучоны з сусветным імем, — гэта Ганаровая грамата Прэзідыума АН СССР. І гэта за 80 гадоў жыцця. Ні ордэна, ні нават медаля...

Нягледзячы на ўсе жыццёвыя выпрабаванні, якія сустракаліся на яго шляху, (у 1950 годзе зноў быў рэпрэсіраваны. — **Э. І.**), Мікалай Мікалаевіч заставаўся вельмі чулым, добразычлівым чалавекам, можна без перабольшання сказаць, Чалавекам з вялікай літары. Як вучоны ён карыстаўся вялікім аўтарытэтам.

Сярод аўтографаў на кнігах, падораных яму беларускімі пісьменнікамі і вучонымі, ёсць і такія: *«Мікалаю Мікалаевічу Улашчыку, які на вечары аўтара 8 лютага 1971 года пераканаўча даказаў, што зямля беларуская не выпадкова дала свету Кірылу Тураўскага і Сымона Полацкага і што дараванне іх не згасла, жыве і цяпер.*

Іван Мележ.
23.02.71. Каралішчавічы».

Або такі:

«Мікалаю Мікалаевічу Улашчыку з глыбокай павагай і ўдзячнасцю за ўсё, што Вы зрабілі для савецкай навукі, для роднай Беларусі.

К. Мазураў.
Люты, 1985, Масква».

Мікалай Мікалаевіч Улашчык памёр 14 лістапада 1986 года на 81-м годзе жыцця, у Маскве.

Выконваючы яго завяшчанне, сын М. М. Улашчыка — Аляксандр Мікалаевіч і малодшая сястра, Вольга Мікалаеўна, перавезлі урну з яго прахам у Мінск для пахавання на Чыжоўскіх могілках, побач з яго жонкай, доктарам біялагічных навук Наталляй Маркаўнай Улашчык. Праводзіць выдатнага вучонага-гісторыка ў апошні шлях прыйшло тады шмат творчай інтэлігенцыі, вучоных і студэнтаў сталіцы Беларусі.

Уклад М. М. Улашчыка ў развіццё навукі і культуры Рэспублікі Беларусь дастойны таго, каб яго імя насілі вуліцы і плошчы гарадоў нашай рэспублікі.

Эмануіл ІОФЕ,
доктар гістарычных навук,
прафесар.

СВЯТЫ

АМАЛЬ ЖЫЦЦЁ

Святы Валянцін падарыў католікам цудоўны дзень, калі кожны можа думаць пра каханне. Але 14 лютага лічаць святам не толькі закаханыя каталікі і не толькі моладзь. У кожнага бываюць моманты, калі хочацца ўзгадаць самыя-самыя шчаслівыя імгненні. У гэты дзень прынята дарыць адзін аднаму «валянцінчык» — маленькі падарунак ад усёй душы. Але што можа быць больш цудоўным, чым кветкі? Дарэчы, можа і ў іх ёсць сваё ўяўленне пра каханне. Паслухаем.

Вальс кветак у шкляным посудзе

ДОЎГІ СУМНЫ калідор пераходу. Холадна тут стаяць зімой, ды яшчэ прадаваць кветкі. І людзей стала меней. Раней убачыш парачку, прапануеш кветкі — лічы, кліент твой. Няёмка з дзяўчынай прайсці міма. А зараз парачкі ходзяць рэдка. Трэба вельмі пастарацца, каб прадаць патрэбную норму кветак. За дзень так настаішся, што прымерзлая да твару ўсмешка трымаецца нават тады, калі яна недарэчы. Адзіная надзея — на святы. Размясціўшы свой тавар у шкляным акваріуме, кветачніца ўнесла ў карціну цёмнага ранішняга падзямелля апошні штрых: прыкурыла ад агарка свечкі і ўладкавала яе на дне, асвяціўшы жыццё шклянога сасуда.

Ад нечаканага святла кветкі прачнуліся. Ім зусім не хацелася ў такую раніцу распраўляць вянчыкі сваіх прычосак. Але знаёмая свечка нагадала пра тое, што сёння свята і абавязкова будзе баль. Для кагосьці — першы, для кагосьці — апошні.

Старая пабляклая гербера з сумам паглядзела на трапяткую моладзь. Наіўныя, яны імкнуцца трымацца з гонарам, паказаць сябе з лепшага боку. Яны яшчэ не ведаюць, што людзі наўрад ці змогуць ацаніць тое, пра што не мацюць уяўлення. Шчырасць прыгажосці, якую нясуць кветкі. Людзям патрэбен падарунак. І ўсё. Старая разумная гербера падумала, што цяперашні час, які б падвальны ён ні быў, яшчэ не самы страшны. Інтуіцыя ёй падказвала, што тыя кветкі, якія знікаюць разам з людзьмі, атрымліваюць усяго толькі ілюзію лепшага жыцця. Калі яны не будуць адвергнуты адразу, то рана ці позна іх усё роўна чакае сметніца. Мама ў дзяцінстве ёй казала, што быццам бы пасля смерці ўсе сустракаюцца менавіта там. Пра лепшую долю сціплых кветак пакуль ніхто не чуў. Таму разумная гербера заўсёды трымалася ў цяні і ўжо паспела саставець. А дзе ж той прыгожы сусед, які ўчора моцнымі лісткамі падтрымліваў яе тоненькую сцяблінку? Ён так быў у яе закаханы! Дзеля таго, каб іх не разлучылі, перарэзаў сабе вены, за што гаспадыня ледзь не адарвала яму галаву і не нанізала яе на іголку, як гэта робяць у такіх выпадках. Цяпер ён вяне натуральным чынам у процілеглым вуглу сасуда, а яна далёка ад яго і не можа нават спадзявацца на сумесную старасць...

Гандлярка зледзянелымі рукамі ўскалыхнула роўнае полымя свечкі, вырашыла лепей прадставіць свой тавар. Пышныя і прыгожыя кветкі апынуліся побач, астатнія — для масавасці — прыцхлі па вуглах.

«Навошта яна так жорстка ўварвалася ў наша жыццё? — думаў высокі кавалер з пышнай чырвонай шавялюрай, які падчас вялікага перасялення выпусціў з поля зроку сваю сяброўку. — Мала таго, што гэтыя людзі самі перасталі адчуваць павольны рытм вальса, дык яшчэ збіваюць з такту іншых, пастаянна блытаюць фігуры, парушаюць рытм, які ўстанавіла прырода. А можа ў яе няма слыху і яна не адчувае музыкі любові? — асяніла яго здагадка. — Бедная...»

А яго сяброўка, якая даўно марыла пра іншага, цяпер апынулася ў самым выгадным становішчы і чакала не менш як прынца. Яе ружовыя шчочкі літаральна палалі, калі яна аддавалася сваім ружовым марам пра чалавека, які здольны палюбіць прыгажосць. У гэтым душным акваріуме ёй мала месца. Ад рук зайздросніцы-гаспадыні, якая ніяк не можа адшукаць свой прыродны шарм, вее холадам. Яе, герберу, якая дастойна жыць у добрым доме.

Ларыса ЦІМОШЫК,

Што такое каханне?..

Падалі з неба кроплі. Па дарозе ў асеннім парку ішла дзяўчына. На шчацэ — мокры след. Гэта дождж ці слёзы?

☺

...Зімою расцвіла ружа. І доўга глядзелася ў шкло з марозным малюнкам.

☺

...На мільён дробных зззяючых кавалачкаў разбіўся хрустальны бакал. На шчасце?

☺

...Нехта глядзеўся ў люстэрка і не знаходзіў адлюстравання.

☺

Сэрца рвецца, сэрца баліць... Ад радасці ці ад болю?..

☺

— Колькі часу?

— Не ведаю. Сапсаваўся пясочны гадзіннік. Залатыя крупінкі часу застылі і не варухнуцца стрэлкі.

☺

І вось прыйшло яно — велізарнае і зззяючае — каханне!..

Ці бывае, калі прадмет не адкідвае ценю?

☺

Каханне... пытанні без адказаў.

Крысціна КУРЧАНКОВА, *16 гадоў.*

ШАШКІ

ЯКІ ВЫНІК?

На дыяграмах дзве вельмі падобныя пазіцыі. Толькі белая простая ў адной стаіць на a3, у другой — на c3. Прааналізуйце пазіцыі і дайце адказ, ці выйграюць белыя пры сваім ходзе ў першым і другім выпадку?

Белыя: дамкі h6, h8, простая a3 (3). **Чорныя**: дамка b8, простая h4 (2).

Белыя: дамкі h6, h8, простая c3 (3). **Чорныя**: дамка b8, простая h4 (2).

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць раней за іншых правільныя адказы, мы апублікуем у наступных шашачных выпусках.

ПРАВЕРЦЕ РАШЭННІ

АГУЛЬНАЯ РЫСА (31 студзеня). У абедзвюх пазіцыях выкарыстана адно і тое ж правіла гульні, т. зв. «турэцкі ўдар» — «шашкі здымаюцца з дошкі толькі пасля завяршэння ўдара (узяцця)».

У першай пазіцыі рашэнне такое: 1. h2-g3 h4:e5 2. f4:b8 або 2. f4:h6 з выйгрышам.

У другой пазіцыі: 1. h4-e7! (белыя ахвяруюць адзіную дамку) 1. ... c5:f8 2. e5-d6 f8:e5. Чорныя маюць права і абавязаны біць толькі так. Далей ідзе: 3. d4:h8, і белыя лёгка выйграюць, бо чорную простую h6 кантралюе белая простая e3.

Першымі адказ даслалі Дзмітрый Жылко з г. Лунінца і Л. Яфстаф'еў з г. Маладзечна.

ТЭЛЕБАЧАННЕ, 14 лютага

Беларускае тэлебачанне

7.30 Раніцы кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 «Пажар у флігелі», «Дзень добры, Ральф!». Маст. фільмы.
9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 11-ы клас. «Праўда жыцця». Іван Мележ і яго раман «Людзі на балоце».
9.30 «Вестгейт». Тэлесерыял.
10.25 Зорная ростань. Брэсцка-Магілёўскі тур.
11.05 Відзьма-нявідзьма.
12.05 «Сабака Баскервіляў». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.00 Навіны.
15.15 «Востраў скарбаў». Мультфільм. Фільм 1-ы.
16.05 Майстэрня. «Памёк чорным і белым». Памяці Алеся Звонака.
16.35 Сугучнасць. «VII Міжнародны музычны фестываль імя І.І.Салярцінскага». Частка 2-я.
17.20 Госці ў хату.
17.50 Музычны антракт.
18.00 Крэда.
18.15 «Фарбы зямлі роднай». Кінанарыс.
18.25 Эканамікст.
18.35 «Тройчы па аднаму». Музычная перадача MTV.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.05 Бар'еры. Інваспорт на Беларусі (жывы эфір).
19.40 «Вестгейт». Тэлесерыял.
20.40 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.05 «Цудоўная спрачальніца». Маст. фільм (Францыя). 4-я серыя.
23.20 Каралеўскае паляванне.
24.00 Навіны.

ГРТ

5.00 Тэлеранціца.
8.00 Навіны.
8.15 «Сакрат Траліканкі».
9.05 Тэма.
9.45 У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
10.20 «Ох і Ах». Мультфільм.
10.30 «Адгадай мелодыю».
11.00 Навіны (з сурдаперакладам).
11.10 У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». «Кантакт — дзелавое супрацоўніцтва краін Садружнасці».
11.50 «Супрацьстаянне». Серыял. 4-я серыя.
13.00 «Жоўцік». Мультфільм.
13.10 «Т.С.Н.» («Тэлевізійная служба навін»).
14.00 Навіны (з сурдаперакладам).
14.20 «Драконы падзямелляў».
14.40 Кактус і К°.
14.50 До-мі-соль.
15.10 Покліч джунгляў.
15.35 «Элен і хлопцы».
16.00 Тэт-а-тэт.
16.30 Сем дзён спорту.
17.00 Навіны.
17.20 «Сакрат Траліканкі».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мелодыю».
19.00 «Каб памяталі...» Іван Мікалайчук. Вядучы — Л.Філатаў.
19.45 «Добрай ночы, малышы».
19.55 Рэклама.
20.00 Час.
20.30 «Аперацыя».
20.40 Рэклама.
20.50 Наталля Андрэйчанка ў меладраме «Ваенна-палявы раман».
22.25 Прэс-клуб.
23.20 Навіны.
23.30 «Т.С.Н.». («Тэлевізійная служба навін»).
0.20 Сем дзён спорту.
0.50 «Начны візіт». Тэлефільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

6.30 Час дзелавых людзей.
7.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
7.25 Патрабуюцца...
7.30 «Што дзень наступны...»
7.35 Рытміка.
7.50 Усяго патроху.
8.45 Сялянскае пытанне.
9.05 «Санта-Барбара».
10.20 Міліцэйская хроніка.
10.30 Музычны экспромт.
10.45 «Чароўны школьны аўтобус». Мультсерыял.
11.15 Новая лінія.
15.05 Там-там навіны.
15.20 Свята кожны дзень.
15.30 Чый бок?
16.20 Далёкі Усход.
16.50 Нікто не забыты.
16.55 Вас запрашае фірма.
17.10 Кіпрас Мажэйка. «Паралелі».
17.25 Свая гульня.
17.55 Кіно з працягам. «Пецярбургскія тайны».
19.25 Падрабязнасці.
19.35 «Санта-Барбара».
20.30 «Ад фортэ да піяно».
21.05 Кліп-антракт. Шандар.
21.10 Хакей. Чэмпіянат МХЛ. «Дынамо» — «Спартак».
22.30 Рака часу.
22.35 Аўтаімгненне.
22.40 Лад-экран. «А цяпер пра гэта...»

НТВ

17.00 Кінатэатр юнага гледача. «Цудоўныя гады». 78-я серыя (ЗША).
17.30 Аўтагонкі «Усе зоркі».
18.00 «Сёння». Інфармацыйная праграма.
18.35 Герой дня.
19.00 Свет кіно. Дэзэл Вашынгтон у фільме «Магутны Кукі» (ЗША).
20.40 Дзецям. Мультфільмы на ноч «Старадаўняя балада», «Гультайства».
21.00 «Сёння». Інфармацыйная праграма.
21.35 Гадзіна серыяла. «Доктар Куін, жанчына-ўрач». 30-я серыя (ЗША).
22.30 Часінка.
23.00 «Сёння». Інфармацыйная праграма. Начны выпуск.
23.20 Кафэ «Абломаў».

Санкт-Пецярбург

12.00, 15.30, 18.30, 21.45 Інфарм ТБ.
12.10 «Гром у раі». Серыял.
12.55, 19.45, 21.00 Музычны момант.
13.00 Хуткая дапамога.
13.30 Парады садаводам.
13.40 «Клятва». Маст. фільм (Індыя). 1-я серыя.
15.00 Экспрэс-кіно.
15.15 Стыль жыцця.
15.40 «Нямецкая хваля».
16.00 Мультфільм.
16.10 Тэатральны біноклі.
16.40 «Матрошчыны паштоўкі».
17.10 Паказвае Ленінградская АТК.
18.10 Вялікі фестываль.
18.50 Спартыўныя навіны.
18.55 «Гром у раі». Серыял.
19.50 Тэлеслужба бяспекі.
20.00 Гадзіна мара.
21.05 Блеф-клуб.
22.00 Спорт, спорт...
22.10 Дзень нараджэння.
22.20 Хакей. Чэмпіянат МХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Поўначсталь» (Ч